Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Аддзел адукацыі Ашмянскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К. Багушэвіча”

# Выкарыстанне экспазіцыі музея ўстановы адукацыі ў выхаванні грамадзянскасці, патрыятызму навучэнцаў

Складальнік Лукша Галіна Браніславаўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

Жупраны 2013

**ЗМЕСТ**

Уводзіны 4

1.1. Значэнне школьнага музея ў грамадска-патрыятычным выхаванні моладзі 5

1.2. Гісторыя стварэння школьнага літаратурнага музея 5

1.3. Экспазіцыя музея 6

1.4. Праз музей – да сэрца кожнага 7

1.5. Пошукавая і даследніцкая дзейнасць школьнікаў – значны ўклад у развіццё музея 8

1.6. Літаратурны музей – цэнтр выхаваўчай работы школы 9

Заключэнне 10

Літаратура 13

Дадаткі

Дадатак 1. Фотаматэрыялы з гісторыі стварэння музея 14

Дадатак 2. План работы лектарскай группы 19

Дадатак 3. Матэрыялы для лектарскай групы. “Багушэвіч у Кушлянах” 20

Дадатак 4. Гісторыя заснавання літаратурнага музея Ф.К.Багушэвіча 26

Дадатак 5. Тэатралізаваная экскурсія па літаратурным музеі Ф.К. Багушэвіча 34

Дадатак 6. На беразе хуткай Ашмянкі (па матэрыялах “Настаўніцкай газеты”) 38

Дадатак 7. Гісторыя Багушэвічавай “Дудкі” 42

Дадатак 8. Музейныя заняткі 45

Дадатак 9. Чалавек, які пакінуў след у гісторыі Ашмяншчыны 46

# УВОДЗІНЫ

Вельмі важнай задачай сучаснай школы з’яўляецца выхаванне ў дзяцей і навучэнцаў патрыятызму і грамадзянскасці, маральных якасцей. На гэта накіравана ўся школьная сістэма выхаваўчай работы, як класнай, так і пазакласнай. І гэта нармальная з’ява: кожная дзяржава ў першую чаргу павінна клапаціцца пра такі накірунак выхавання, таму што любой краіне патрэбны адданыя ёй людзі, якія не толькі любяць той край, дзе нарадзіліся і жывуць, але і стараюцца зрабіць жыццё ў ім лепшым, больш уладкаваным і шчаслівым, і не горшым, чым у суседзяў.

Патрыятызм – гэта любоў да Радзімы і свайго народа, адданае служэнне іх інтарэсам, шанаванне лепшых нацыянальных традыцый. Патрыятызм – адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, замацаваных стагоддзямі існавання сваёй Айчыны. Тое ж самае датычыцца і грамадзянскасці: гэта прававая прыналежнасць асобы да пэўнай дзяржавы, выкананне яе законаў і звычаяў.

Гэтыя задачы вырашаюцца на ўроках, пазакласных мерапрыемствах, але найбольш паспяхова яны могуць быць вырашаны шляхам прыцягнення вучняў да ўдзелу ў краязнаўчай рабоце. Назіраючы за жыццём сваёй краіны, знаёмячыся з яе гісторыяй, прыродай і культурнымі асаблівасцямі, выконваючы асобныя краязнаўчыя заданні, вучні вучацца па-сапраўднаму любіць сваю краіну, даражыць ёю. Чым больш яны будуць ведаць пра яе, тым хутчэй будуць станавіцца нацыянальна свядомымі грамадзянамі.

Перад маладым, несфарміраваным яшчэ чалавекам, якім з’яўляецца сённяшні школьнік, паўстае пытанне: а для чаго мы жывём, дзе нашыя карані, што нас чакае ў будучыні? У поўнай меры адказ на гэта пытанне даў класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч: “У падзеях мінулага – нашы карані. А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш – прыносіць плады”. Вось чаму выхаванне нацыянальнай самасвядомасці патрэбна пачынаць з вывучэння сваёй малой радзімы, будзь то вёска, пасёлак ці

горад. Каб вучні адчулі, што і іх родная зямля поўніцца талентамі, нараджае герояў; што і тут стваралася гісторыя народа і краіны.

Таму задача выхавання патрыятызму і грамадзянскасці ў навучэнцаў была і будзе актуальнай ва ўсе часы існавання сістэмы адукацыі, ва ўсе часы існавання дзяржаўнасці. Менавіта яна дае магчымасць выкарыстання для сябе і краіны гістарычнага вопыту народа, калі можна ўзяць з мінулага ўсё патрэбнае для вырашэння сённяшніх задач; калі можна забяспечыць сувязь пакаленняў і падтрымаць пераемнасць у захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей грамадства. Спачатку вучні павінны стаць сапраўднымі беларусамі, якія ведаюць родную краіну – яе мінулае і сённяшні стан; а без апоры на свае карані зрабіць гэта будзе немагчыма. Таму кола і замыкаецца.

Патрэбна веданне сваёй гісторыі, свайго радаводу. І калі ў радаводзе сустракаецца хтосьці з продкаў, кім можна ганарыцца, хто праславіў свой род – тады і дзеці самі пачнуць ганарыцца сваімі продкамі, тымі, чыё прозвішча яны носяць. А гісторыя краіны – гэта наш агульны радавод, паколькі ўсе мы маем агульных продкаў. І сярод іх было нямала тых, кім мы можам ганарыцца на Радзіме і за межамі нашай краіны перад другімі народамі.

Захоўваць гістарычную, культурную спадчыну продкаў, выхоўваць у школьнікаў павагу ў першую чаргу да саміх сябе заклікані музеі ўстаноў адукацыі.

## 1.1. ЗНАЧЭННЕ ШКОЛЬНАГА МУЗЕЯ Ў ГРАМАДСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ

На мяжы XXI стагоддзя назіраецца збядненне духоўнага свету падрастаючага пакалення, перанасычэнне яго свядомасці інфармацыяй з розных сродкаў масавай інфармацыі: інтэрнэт, відэа і аўдыяпрадукцыя, спутнікавае тэлебачанне. Моладзь і падлеткі страчваюць сувязь з культурнай спадчынай народа. Змяняюцца многія жыццёвыя арыенціры падрастаючага пакалення. Як змяніць сітуацыю? Як выхаваць духоўна багатую і ўсебакова развітую асобу, сэнс жыцця якой быў бы цесна звязаны з лёсам народа, краіны? Якія прынцыпы

і тэхналогіі для гэтага выкарыстаць? Гэтыя пытанні хвалююць кожнага педагога сучаснай школы. Таму ўзнікла неабходнасць мэтанакіраванай працы па фарміраванні ў школьнікаў погляду на нацыянальную культуру як на фундаментальную духоўную каштоўнасць народа. Бо толькі той чалавек, які засвоіў культурныя каштоўнасці свайго народа, зможа актыўна ўплываць на жыццёвыя абставіны і аналізаваць стваральную дзейнасць людзей. Такім чынам, каб пераадолець сацыяльную абыякавасць, выхаваць у школьнікаў патрыятызм, любоў да Радзімы, грамадзянскую адказнасць за дзяржаву, каб вырасціць грамадзян, якія неабыякавыя да лёсу свайго народа, нам, настаўнікам, па-першае, трэба памятаць пра неабходнасць і першачарговую важнасць арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання; па-другое, стварыць канкрэтныя ўмовы, пры якіх яно будзе магчыма. Вядома, што ўключэнне асобы ў грамадства павінна суправаджацца адукацыйна – выхаваўчым працэсам. Велізарныя магчымасці ў вырашэнні дадзенага пытання належаць музейнай педагогіцы і дзейнасці школьнага музея ў цэлым. Менавіта праз дзейнасць музея існуе магчымасць выхоўваць патрыёта і грамадзяніна не на абстрактных ідэалах, а на дакладных прыкладах, на далучэнні вучняў да гістарычнай і культурнай спадчыны "малой радзімы”. Толькі ведаючы свае карані чалавек можа стварыць сваё светлае будучае. Менавіта музей нясе ў сабе найважнейшую выхаваўча-адукацыйную функцыю. У музеі дзеці судакранаюцца з прадметамі – праўдзівымі сведкамі культурнай спадчыны народа, яго багацця. Дзейнасць школьнага музея, накіраваная на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, вельмі актуальная і адпавядае накірункам дзяржаўнай палітыкі ў сферы агульнай сярэдняй адукацыі: "Вызначэнне зместу агульнай сярэдняй адукацыі на аснове прыярытэту нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, запытаў асобы, грамадства і дзяржавы.” Асноўнымі накірункамі выхаваўчай работы ў агульнаадукацыйных установах адукацыі з’яўляюцца: фарміраванне духоўна і маральна сталай творчай асобы на аснове нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей; выхаванне грамадзяніна і патрыёта; выхаванне павагі да сябе,

іншых людзей, да сям'і, традыцый і звычаяў беларускага народа…" "Дасягненне мэтаў выхавання ва ўстановах адукацыі прадугледжвае вырашэнне асноўных задач: фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі. Змест выхавання засноўваецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, дзяржаўнай ідэалогіі, адлюстроўвае інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы" Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі накіравана на засваенне моладдзю агульначалавечых каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый беларускага народа і ідэалогіі беларускай дзяржавы, фарміраванне гатоўнасці да выканання грамадзянскага абавязку. А нацыянальная самасвядомасць дзяцей і падлеткаў, як вядома, складаецца з усведамлення імі свайго этнагенэзу, дакладней з ведаў паходжання свайго роду, беларускага народу, для якога важнейшымі якасцямі ва ўсе часы былі патрыятызм, працавітасць, высокая маральнасць, а таксама паважнасць, добразычлівасць, гасціннасць, памяркоўнасць, талерантнасць, аптымізм. Менавіта таму, выхаванне патрыятызму, станаўленне нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскай годнасці школьнікаў праз вывучэнне і захаванне гістарычнай спадчыны стала асноўнай мэтай дзейнасці школьнага музея. Бо толькі музей мае магчымасць спалучыць у сабе і навукова-даследніцкую, і навукова-асветніцкую, і выхаваўчую ўстанову, якая выконвае на аснове музейных прадметаў функцыі адукацыі і выхавання грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

З якой хуткасцю бяжыць час. Асабліва гэта адчуваецца ў перыяды сацыяльных змен у грамадстве. Любы пераломны момант у жыцці людзей суправаджаецца і з'яўленнем новых, часам з цяжкасцю ўспрымаемых, каштоўнасцей. У такі час узнікае жаданне трымацца за штосьці трывалае, непарушнае. Такой апорай у чалавека заўсёды застаецца памяць, якая дае сілы прыняць новае, не патраціўшы пры гэтым тое каштоўнае, што назапашана чалавецтвам. Захавальнікамі памяці заўсёды былі і застаюцца музеі. Для большасці школьнікаў Беларусі менавіта са школьнага музея і пачынаецца іх

грамадзянскае станаўленне. У школьным музеі дзеці ўпершыню пачынаюць асэнсоўваць сваё дачыненне да ўсяго, што адбываецца навокал, а словы Радзіма, родны кут, любоў да Айчыны, подзвіг, патрыятызм напаўняюцца новым сэнсам. Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне з’яўляецца важным накірункам дзяржаўнай палітыкі ў адукацыі.

Асаблівая роля ў развіцці дастойнага грамадзяніна сваёй краіны належыць выхаваўчым установам. Прыярытэтаў і асноўных накірункаў гэтага выхавання шмат. Але, пагадзіцеся, любоў да Радзімы, імкненне самааддана служыць свайму народу, захоўваць яго мову, культурную і гістарычную спадчыну, звычаі і традыцыі немагчымы без дасканалага вывучэння роднага краю. А любоў да Радзімы фарміруецца ў ходзе работы з гістарычным матэрыялам, які раскрывае традыцыі беларускага народа, гераічную барацьбу, подзвігі, таленты лепшых сыноў краіны, павагу да сімвалаў і атрыбутаў дзяржавы. І сёння, калі перад школай вельмі востра стаіць праблема выхавання асобы з уласцівымі ёй якасцямі грамадзяніна, патрыёта нашай краіны, асобы, здольнай аддаваць усе свае сілы і веды на карысць Бацькаўшчыны, пачэснае месца належыць дзейнасці музеяў. Менавіта яму наканавана стаць тым сродкам, які будзе садзейнічаць нацыянальна-культурнаму адраджэнню беларускага народа праз пазнанне непаўторнасці яго гістарычнага шляху, матэрыяльнай і духоўнай культуры, праз усведамленне яе нацыянальнай каштоўнасці ў суквецці славянскай, еўрапейскай і сусветнай культуры. Менавіта дзейнасць музеяў павінна закласці аснову для выхавання чалавека – грамадзяніна, гаспадара сваей зямлі, адказнага за вынікі сваей працы і за лёс сваёй краіны. Тэма грамадзянска-патрыятычнага выхавання закранае важнейшыя састаўляючыя выхаваўчай работы ў школе. Выхаванне грамадзяніна. Што мы робім сёння для гэтага? Што ўкладаем у падрастаючага чалавека? У ДУА "Жупранская сярэдняя  школа імя Ф.К. Багушэвіча” абраны шлях выхавання праз адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальных каштоўнасцей беларускага народа. Упэўнены, што вырашэнне многіх праблем залежыць ад узроўню сфарміраванасці грамадзянскай пазіцыі,

павагі да нацыянальнай спадчыны. Кожны куточак на Беларусі захаваў свае адметныя асаблівасці, сваю самабытнасць. Застаецца толькі знайсці і зберагчы гэтыя дары. Гэта мы і спрабуем зрабіць у школьным літаратурным музеі Ф. К. Багушэвіча. Тут можна зазірнуць у гісторыю жыцця і творчасці нашага земляка, пазнаёміцца з невядомымі старонкамі жыцця Багушэвічавай радні.

Значная частка краязнаўчай работы ў школе праходзіць праз школьны музей, які павінен з'яўляцца цэнтрам грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання моладзі. Праз удзел у стварэнні і папаўненні экспанатамі экспазіцыі музея, выпрацоўцы тэкстаў і правядзенні экскурсій вучні больш дэталёва знаёмяцца з гісторыяй і культурай сваёй краіны, жыццём людзей у ёй і, такім чынам, далучаюцца да агульнанацыянальных каштоўнасцей свайго народа, пачынаюць яшчэ больш любіць сваю краіну.

Роля школьнага музея ўсё больш узрастае з цягам часу, таму што менавіта праз яго можна давесці да школьнікаў веды па гісторыі і культуры свайго народа і перадаць іх у больш цікавай, чым на ўроках, форме. Тым больш, што такі музей будзе заўсёды побач, у любы час школьнага жыцця. Акрамя гэтага, прыцягненне вучняў да працы ў школьным музеі, удзел у пошукавай і краязнаўчай рабоце зможа адцягнуць некаторых з іх ад характэрнай для часткі моладзі бездухоўнасці, напоўніць сэнсам іх школьнае жыццё, даць накірунак да самаразвіцця і тым самым прынесці карысць Радзіме.

## 1.2. ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ ШКОЛЬНАГА ЛІТАРАТУРНАГА МУЗЕЯ

Зямля ашмянская вядома славутымі людзьмі, памяць пра якіх зберагаецца і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Старасвецкія жупранскія лясы, вузенькія вулачкі маленькага мястэчка, добрыя гасцінныя жыхары натхнялі нашага земляка Францішка Багушэвіча на напісанне бессмяротных радкоў. У сваю чаргу жупранцы, колькі б гадоў не мінула з таго часу, па крупіцах збіраюць і

захоўваюць памяткі пра паэта. Мястэчка даўно ўжо стала месцам, куды прыязджаюць паэты, музыканты, літаратары і проста паклоннікі творчасці вядомага паэта.

Стварэнне музея ў Жупранскай сярэдняй школе імя Ф.К.Багушэвіча было ініцыятывай былога дырэктара школы Крайнова М. І. і настаўніка беларускай мовы і літаратуры Кадыркі К. А.

З успамінаў самога Крайнова М.І. вынікае, што першыя экспанаты ў школьны музей трапілі з Ашмянскага краязнаўчага музея. Пад кіраўніцтвам К.А.Кадыркі вучні школы пісалі ў Дзяржаўны архіў Беларусі, архівы Польшчы, Украіны і Літвы, даследчыку творчасці Ф.Багушэвіча Уладзіміру Содалю.

Экспазіцыя літаратурнага музея стваралася паступова. Аналізавалі цікаўнасць вучняў да тых ці іншых момантаў жыцця краіны і яе гісторыі, біяграфіі Ф.Багушэвіча, улічвалі неабходнасць дапаўнення вучэбнага працэсу ілюстрацыйным матэрыялам, прапаганды дасягненняў школы і паказу ўдзелу вучняў у пошукавай і краязнаўчай рабоце. Так, раздзел за раздзелам, у лагічным парадку выбудоўвалася структура музея, што дазволіла праводзіць не толькі агляднья экскурсіі, а і шэраг тэматычных.

Трапляючы ў літаратурны музей Ф.Багушэвіча, нібы пераносішся ў мінулае зямлі ашмянскай. Праз жыццё песняра наведвальнікі спасцігаюць гісторыю нашага павета, час, эпоху, якая нарадзіла вядомага паэта. Са старых фотаздымкаў глядзяць выявы Жупран: вось касцёл, старажытны выгляд паселішча, а побач – больш сучасныя здымкі, што адлюстроўваюць жыццё мястэчка.

Літаратурны музей Ф.К. Багушэвіча ў Жупранскай школе працуе з 1970 года (*Дадатак 1 )*.З 1984 года яго нязменным кіраўніком з’яўляецца
Лукша Г.Б., настаўнік беларускай мовы і літаратуры. Ва ўсе часы асноўная функцыя музея заключаецца ў выхаванні патрыётаў Беларусі. Музей - асноўны культурна-асветніцкі цэнтр школы.

## 1.3. ЭКСПАЗІЦЫЯ МУЗЕЯ

На сённяшні дзень у музеі створана восем невялікіх раздзелаў:

-Дзяцінства і юнацтва. Свіраны. Кушляны.

- Гады вучобы. Вільня. Пецярбург. Доцішкі.

- Удзел у паўстанні. Аўгустоўская пушча.

- У выгнанні. Украіна.

- Мужыцкі адвакат. Вільня.

- Першая кніга – “Дудка беларуская”. Кракаў.

- “Смык беларускі”. Познань.

- Апошнія гады жыцця. Кушляны. Жупраны.

У музеі налічваецца каля 200 экспанатаў. Сярод якіх ёсць і арыгінальныя: драўляная скульптура Ф.К.Багушэвіча (работа народнага ўмельца Пятра Бусловіча), партрэт паэта намаляваў Анатоль Жолуд, былы настаўнік чарчэння і малявання Жупранскай СШ, кніжкі паэта. Арыгінальныя зборнікі “Дудка беларуская” (1922 года выдання і 1946 года выдання) былі падараваны музею жыхаром вёскі Кісялева Ашмянскага раёна Ю. Падляцкім. А зусім нядаўна ў музеі з’явілася яшчэ адна карціна мясцовага мастака Уладзіміра Шымановіча “Сядзіба ў Кушлянах”. Існуе ў музеі вельмі добрая традыцыя – наведвальнікі пакідаюць у дар музею кнігі з аўтографамі.

Цікавасць да асобы беларускага песняра, а значыць і да яго музея, з гадамі не змяншаецца: адно: прачытаць пра жыццё і творчасць у кніжцы, другое – убачыць, дакрануцца да вытокаў, перанесціся ў 19 стагоддзе. Таму і едуць у Жупранскую школу з вялікіх і малых гарадоў Беларусі. Штогод у музеі праводзіцца 15-20 экскурсій; колькасць наведвальнікаў дасягае 350 чалавек. Вялікая колькасць людзей прыходзіць у музей у Дзень нараджэння паэта і на пазакласныя мерапрыемствы.

Кожны юбілей Францішка Багушэвіча адзначаецца шэрагам мерапрыемстваў і змястоўнай выставай. Да 170-годдзя са дня нараджэння паэта ў музеі была арганізавана выстава пад назвай “Шануем памяць аб табе, наш

славуты зямляк”. У наведвальнікаў музея была ўнікальная магчымасць пазнаёміцца з фото- і тэкставымі матэрыялаі, “прачытаць” радавод сям’і Багушэвіча, падараваны музею Васілём Юршам, даследчыкам радаводаў беларускай шляхты. Зазірнуць у глыбіню літаратурнай спадчыны Ф.Багушэвіча можна, пазнаёміўшыся з гісторыяй выхаду ў свет “Дудкі беларускай” (1891 год). Вучні і настаўнікі Жупранскай школы прынялі ўдзел у канферэнцыі, прысвечанай юбілею паэта, дзе прадставілі віртуальную экскурсію па нашаму літаратурнаму музею.

Пры літаратурным музеі школы дзейнічае савет музея, існуе група экскурсаводаў з ліку навучэнцаў школы, распрацаваны план работы лектарскай групы (*Дадатак 2, 3*). Накірункі дзейнасці літаратурнага музея Ф.Багушэвіча:

- экскурсійная работа;
- даследаванне і адкрыццё невядомых старонак жыцця і дзейнасці Ф. Багушэвіча;
- навукова-даследчая работа па вывучэнні гісторыі школы і аг. Жупраны;
- даследчая работа па вывучэнні жыцця і дзейнасці знакамітых землякоў;
- арганізацыя фальклорных свят, літаратурных гасцёўняў, сустрэч з цікавымі людзьмі.

## 1.4. ПРАЗ МУЗЕЙ – ДА СЭРЦА КОЖНАГА

Акрамя экскурсій у памяшканні музея праводзяцца ўрокі, праходзяць заняткі факультатываў і гурткоў. У скарбонцы педагагічнага вопыту кожнага настаўніка школы ёсць урокі, звязаныя з музеем. Школьны музей з’яўляецца зручным месцам для правядзення класных гадзін, сустрэч са знакамітымі людзьмі, школьных святаў, вечарын, віншаванняў настаўнікаў з юбілеямі, пасяджэнняў школьных клубаў, арганізацыі выстаў. Нярэдка ў музеі праводзяцца і семінары розных узроўняў.

У школьным музеі захоўваюцца “Гісторыя школы”, “Гісторыя стварэння музея” (*Дадатак 4),* матэрыялы аб даследчай і пошукавай дзейнасці вучняў; створана медыятэка. Для правядзення ўрокаў і мерапрыемстваў музей абсталяваны неабходнымі тэхнічнымі сродкамі.

У сваёй рабоце музей выкарыстоўвае разнастайныя формы работы:

- вядзенне “Летапісу школы”;
- арганізацыя выстаў;
- правядзенне лекцый;
- правядзенне аглядных і тэматычных экскурсій;
- правядзенне семінараў;
- правядзенне тэматычных ўрокаў па гісторыі, беларускай літаратуры, рускай мове, выяўленчым мастацтве з выкарыстаннем экспазіцыі музея;
- заняткі гурткоў, клубаў і факультатываў;
- правядзенне тэматычных вечарын, школьных конкурсаў;
- правядзенне тэматычных класных гадзін;
- арганізацыя сустрэчаў з ветэранамі вайны, цікавымі людзьмі;
- правядзенне музейных заняткаў. (*Дадатак 8*)

## 1.5. ПОШУКАВАЯ І ДАСЛЕДНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ-ЗНАЧНЫ ЎКЛАД У РАЗВІЦЦЁ МУЗЕЯ

Літаратурны музей школы праводзіць сур’ёзную работу па выхаванні патрыятычных якасцей у школьнікаў. Гэта робіцца як з дапамогай лекцый *(Дадатак 4*), экскурсій (*Дадатак 5*), так і шляхам удзелу вучняў у пошукавай і навукова-даследчай дзейнасці. Так, напрыклад, вучаніца нашай школы Васюковіч Рэната правяла даследчую работу па вывучэнню жыццёвага і творчага шляху Ф.К. Багушэвіча, Лукша Анастасія – па гісторыі мястэчка Жупраны. У выніку напружанай работы з’явіліся віртуальныя экскурсіі

“Жупранская старонка”, “Гісторыя вёскі Жупраны”, “Пясняр зямлі беларускай”; гісторыя аднаго экспаната (пра фотаздымак унучкі Багушэвіча Станіславы Тамашэўскай), гісторыя стварэння зборніка “Dudka Bialaruskaja” (*Дадатак 7)*. Вучаніца 11 класа Сяргей Аліна зацікавілася творчасцю нашага земляка Анатоля Вішнеўскага, які сцвярджаў, што ён нашчадак Багушэвіча. У выніку даследавання яго жыцця і творчасці атрымалася навуковая работа. (*Дадатак 9)*

Вучаніца школы Мікуліч Анжаліка, даследуючы гісторыю фотаздымка Багушэвічавай унучкі Станіславы Тамашэўскай, даведалася, што ў сына Багушэвіча Тамаша былі тры дачкі: Станіслава, Канстанцыя і Габрыэля, яны вучыліся ў Ашмянскай гімназіі.

Станіслава Тамашэўская нарадзілася ў 1910 годзе ў сям’і Тамаша Вільгельма Багушэвіча і Юзэфы Маркоўскай (суседкі Багушэвічаў, з якой ажаніўся Тамаш). У яе былі дзве сястры Габрыэля і Канстанцыя (дарэчы, названыя адна ў гонар маці Тамаша Багушэвіча, а другая - у гонар цёткі)

Сястру Тамаша звалі Канстанцыя (Туня).

Станіслава рана засталася без маці. Маці Юзэфа памерла ў 1919 годзе ад тыфу, якім заразілася, даглядаючы параненых у шпіталі, дзе яна працавала санітаркай дабравольна.

А ў 1929 годзе трагічна загінуў і яе бацька Тамаш.

Станіслава і яе сёстры вучыліся ў Ашмянскай гімназіі.

Як стала вядома з успамінаў сына Станіславы Лешэка Тамашэўскага, замуж яна выйшла за Юзэфа Тамашэўскага, сям’я якога была ў выгнанні ў Саратаве, дзе ён і нарадзіўся.

Пасля невядомымі дарогамі вярнуўся ў Польшчу.

Пасля жаніцьбы Станіслава з мужам пасяліліся ў гарадку Падзелёна. Там у 1932 годзе ў іх нарадзілася дачка Крысціна, а ў 1935 годзе – сын Лешэк.

Год 1940 прынёс бяду ў сям’ю Тамашэўскіх. Бацькі дома не было, а Станіславу з 7-гадовай дачкой і 4-гадовым сынам арыштавалі і вывезлі ў Сібір у

Змяінагорск. Нават той факт, што Станіслава была ўнучкай Багушэвіча, не выратаваў іх ад высылкі.
Станіслава трапіла на работу ў рудніке. Умовы працы былі цяжкія. Яна часта выказвала незадавальненне і яе арыштавалі і абвінавацілі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Асудзілі на 8 гадоў лагераў. Яе малыя дзеці засталіся адны ў зямлянцы. Як выжылі? Дзіцячая памяць сына Лешэка не захавала ніякіх звестак пра гэта.

Дзякуючы арміі Владыслава Андэрса, Станіслава была вызвалена з лагера. Немалую ролю ў вызваленні адыграў дзядзька Казімір Абрамовіч.

Пасля гэтага Станіслава разам з дзецьмі трапіла ў Персію (зараз Іран) на цэлы год. Жылі ў Тэгеране. Пасля іх вывезлі ў Індыю ў мястэчка Валівад. Дзеці там хадзілі ў польскую школу, якая была арганізавана спецыяльна для вывезеных.

Сама Станіслава працавала сакратаром-машыністкай ў польскім старостве. І толькі ў красавіку 1947 года сям'я змала вярнуцца ў Польшчу да бацькі, які жыў тады ў Гіжыцку. Бацька працаваў ляснічым у лясніцтве Чырвоны двор. Але нядоўга сям'я была шчаслівай: 25 студзеня 1949 года бацька Ёзэф Тамашэўскі памёр ад сардэчнага прыступу. Зноў увесь клопат пра дзяцей лёг на плечы Станіславы.

Сын Станіславы Лешэк скончыў гімназію ў Гіжыцку, пасля паехаў у Гданьск і паступіў у будаўнічы тэхнікум, які закончыў у 1955 годзе. На працу быў накіраваны ў Шчэцін. Адтуль быў прызваны ў войска. Служыў у Дравно. Там і застаўся пасля службы.

Дачка Станіславы Крысціна (па мужу Шманьда) закончыла хімічную студыю. Жыве ў Варшаве. У яе дзве заслужнія дачкі Гражына Пшэдмойска і Джоана Баяновска. У Гражыны (унучкі Станіславы) ёсць дачка Магдалена, у Джоаны – дачка Ева і сын Філіп.

Сястра Станіславы Канстанцыя жыла ў Сопаце, дзе і памерла. У яе быў сын Эдвард, які памёр ва ўзросце 2-х гадоў у 1939 годзе. Да гэтага часу ў Сопаце жыве дачка Веслава Паліковска, у якой ёсць сын Збігнеў. Ён стала

жыве ў ЗША. Яшчэ адна сястра Станіславы Габрыэля (таксама не жыве) была замужам за лесніком Мендрыгалам.

Жылі непадалёку ля Влоцлавка ў хаце ляснічага. Мелі сына Віктара (не жыве) і дачку Софію.

Усе нашчадкі Багушэвіча жывуць за межамі Беларусі: у ЗША, польскіх гарадах Варшаве, Влолавку, Торыні, Сопаце, Росціні, Дравне. Сярод іх ёсць прадстаўнікі розных прафесій: доктар, геолаг, метрдатэль, натарыус, будаўнік, хімік.

Адзін непрыкметны фотаздымак, а за ім – цэлае жыццё не толькі ўнучкі Багушэвіча, але і родных.

Будзем спадзявацца, што нам удасца наладзіць сувязі з нашчадкамі Багушэвіча, якія яшчэ жывуць.

Усю гэту інфармацыю мы атрымалі ад праўнука Багушэвіча Лешэка Тамашэўскага, які, на жаль, памёр у 2008годзе.

Са Станіславай Тамашэўскай (пакуль яна была жывая) вялася перапіска. Жыла яна ў горадзе Гіжыцку ў Польшчы. У час сталінскіх рэпрэсій Станіславу, чатырохгадовага сына Лешэка і сямігадовую дачку Крысціну арыштавалі і вывезлі ў Змяінагорск (Сібір). Толькі ў 1947 годзе Станіслава з дзецьмі прыехала ў Польшчу і ўз'ядналася з мужам Юзэфам, які ў хуткім часе памёр ад разрыву сэрца (25.01.1949г.). Пра лёс Канстанцыі вядома толькі тое, што яна нарадзілася ў 1913 годзе, а памерла ў 1974 годзе ў Польшчы. Габрыэля нарадзілася ў 1909 годзе, а памерла ў 1984 годзе таксама ў Польшчы.

Дачка Францішка Канстанцыя працавала настаўніцай музыкі ў Ашмянскай гімназіі. Памерла 02.12.1937 года, пахавана ў Жупранах. Мужам яе, дарэчы, быў стрыечны брат Ян Мніховіч.

Сын Тамаш вувучыўся ў Пецярбургу на архітэктара, некаторы час жыў у Барунах, выкладаў у Віленскім універсітэце.А ў лютым 1929 года па дарозе з Варшавы выкінуўся з поезда.

У час першай сусветнай вайны на сядзібе Багушэвічаў размяшчаўся нямецкі ваенны шпіталь, побач з сядзібай хавалі памерлых ад ран нямецкіх салдат

## 1.6. ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ – ЦЭНТР ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ ШКОЛЫ

Музей падтрымлівае шэраг школьных традыцый, сярод якіх наступныя:

- правядзенне агляднай экскурсіі для першакласнікаў
  - 1 верасня;
- правядзенне тэматычнай экскурсіі “Жупранская старонка”;
- віншаванне настаўнікаў школы з юбілеямі, Днё настаўніка;
- правядзенне вечарын ;
- прадаўжэнне напісання “Гісторыі школы”.

Стала добрай традыцыяй праводзіць у музеі літаратурныя вечарыны і экскурсіі для першакласнікаў 1 верасня. Пасля заканчэння школы ў музей абавязкова прыходзяць выпускнікі: частка іх школьнага жыцця застаецца тут, сярод экспанатаў музея, далучаючыся да жыцця іх папярэднікаў. Без музея ўжо немагчыма жыццё школы, бо яно будзе тады чымсьці мімалётным і непаўнавартасным. Таму што менавіта музей з’яўляецца культурна-асветніцкім цэнтрам школы, яе памяццю і візітоўкай.

Вучні Жупранскай сярэдняй школы ганарацца сваім музеем, які дазваляе ім у любы дзень дакрануцца да гісторыі школы і сваёй краіны. З такіх вось больш глыбокіх ведаў пра сваю краіну і пачынаецца патрыятызм, закладваюцца асновы маральнасці, адсюль ў будучым з падлетка вырастае грамадзянін краіны, адказны за яе лёс.

Музей неаднаразова выходзіў пераможцам раённых конкурсаў і аглядаў. Дзейнасць музея, пытанні работы з дзецьмі ў галіне краязнаўства неаднаразова разглядаліся на семінарах рознага ўзроўню, на старонках газет і часопісаў *(Дадатак* 6).

Тыя, хто наведае літаратурны музей, яшчэ раз змогуць пераканацца, што з вышыні больш чым стагадовага шляху, пройдзенага новай беларускай літаратурай ад часу выхаду ў свет твораў Францішка Багушэвіча, яскрава

бачыш і разумееш: і адзін у полі Змагар, калі ты народны Паэт; і адзін Абаронца, калі ты Народны Паэт; і адзін Абаронца, калі ты жыццё і талент кладзеш за пакрыўджаных і абяздоленых. Кажуць, чалавек жыве, пакуль жыве памяць аб ім. Дзякуючы жупранцам, Ф.Багушэвіч будзе саграваць сваімі вершамі яшчэ не адно пакаленне.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Музей як састаўны элемент выхаваўчай сістэмы школы - паўнавартаснае звяно ў адносінах паміж асобай і грамадствам, асобай і сям`ёй, асобай і асобай, сродак фарміравання ў рэгіянальным соцыуме маральных, агульначалавечых адносін. Кожны павінен любіць тое месца, дзе нарадзіўся, дзе жыве. І любоў да родных мясцінаў пачынаецца з маленства, са школьных гадоў. Менавіта тады ў свядомасці юных грамадзян краіны закладваюцца асновы патрыятызму і грамадзянскасці. Таму так важна не прапусціць гэты момант і выхаваць сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, якія б адчулі сябе неад’емнай часткай Бацькаўшчыны.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Горбунов, В.** Школьный музей и воспитание школьников / В. Горбунов // Воспитание школьников. – 2007. - № 5. – С. 17-21.
2. **Залуцкая, О. Л.** Школьный музей / О. Л. Залуцкая, Н. Е. Лугас. – Минск: Красико-Принт, 2007. – 176с.
3. **Историко-краеведческий кружок** // Историческое краеведение Белоруссии / Под ред. Э.М.Загорульского. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980. – С. 221 – 227.
4. **Крючков, А.** Школьный музей: становление и функционирование / А. Крючков // Директор школы. – 2004. - № 4. – С. 50-55.
5. **Кунашка, А.** Краязнаўства – шлях да выхавання грамадзяніна сваёй краіны. / Кунашка, А. // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005. - № 1.
6. **Міронччык, В. У.** Работа музея з дзіцячай аўдыторыяй / В. У. Міронччык // Пачатковая школа. – 2004. - № 6. – С. 22–24.
7. **Ашурков, В. Н.** Историческое краеведение / . В. Н. Ашурков, Д. В. Кацюба, Г. Н. Матюшкин. – М.: Просвещение, 1980.
8. **Півавар, М.** Пошукавы рух як сфера краязнаўчай дзейнасці / М. Півавар // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005.– № 1.
9. **Сурага, Т.М.** Школьны гісторыка-краязнаўчы гурток – эфектыўная форма работы з адоранай моладдзю / Т. М. Сурага // Шляхі развіцця інтэлекта і творчасці маладых. – Гродна, 2001. – С. 170 – 173.
10. **Симоненко, О.** Патриотическое и гражданское воспитание в рамках учебно – воспитательного процесса / О. Симоненко // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2006. – № 2.

ДАДАТАК 1

Фотаматэрыялы з гісторыі стварэння музея



Крайноў Міхаіл Іосіфавіч, дырэктар Жупранскай СШ, ініцыятар стварэння музея



Кадырка Канстанцін Аляксеевіч, былы былы настаўнік беларускай мовы і літаратуры, кіраўнік стварэння першай экспазіцыі музея



Шчыравалі гуртам, дружна і натхнёна дзеці і дарослыя,

Мэтай акрылёныя. Земляка-паэта шануючы свята,

У музей збіралі рэчы, экспанаты.



Адкрыццё музея. На здымку злева –дырэктар школы Кавалёнак Софія Іосіфаўна






Першая экспазіцыя музея размясцілася ў старым будынку Жупранскай школы ў невялікім пакойчыку.



Самай дарагой госцяй нашага музея была Станіслава Тамашэўская, малодшая з трох унучак Багушэвіча. Яна прыехала з Польшчы і падаравала  музею збор твораў Элаізы Ажэшкі.









Частым госцем нашага музея бывае Уладзімір Содаль, рупліўца, даследчык жыцця і  творчасці Ф.Багушэвіча. Дзякуючы яму, мы маем шэраг публікацый у часопісе”Роднае слова” ў рубрыцы “З Кушлянскага кута”, кніжачкі “Жупранская старонка” і “Кушлянскі кут”.







У розныя гады наведалі наш музей і пакінулі ў дар свае кнігі з аўтографамі Ніл Гілевіч, Данута Бічэль, Адам Мальдзіс, Мар’ян Дукса, Ларыса Геніюш. У экспазіцыі маем ліст Ларысы Геніюш да вучняў школы. Данута Бічэль у сваіх вершах не абмінула ўвагай і Жупраны, і Багушэвіча.



У матэрыялах музея ёсць цікавыя ўспаміны Заіра Азгура пра яго работу над помнікам Ф. Багушэвічу, які ўстаноўлены ў Жупранах у 1958 годзе.





Пётр Іосіфавіч Бусловіч, былы  настаўнік Ашмянскай школы глухіх дзяцей, выразаў з дрэва і падараваў музею бюст Багушэвіча.




Жолуд Анатолій Фаміч, былы настаўнік чарчэння і  малявання Жупранскай школы, даволі ўдала напісаў партрэт паэта. Абедзве гэтыя работы выкананы на высокім мастацкім узроўні.





Яшчэ адзін госць нашага музея Сцяпан Александровіч пасля сустрэчы з вучнямі і настаўнікамі, гутаркі з імі пра Багушэвіча, пра Жупранскую зямлю сказаў такія словы: “Тут зямля такая...” І змоўк, пакінуўшы ўсіх у роздуме. А якая тут зямля?” А адказ на гэта пытанне просты: наша зямля багатая на таленавітых людзей. Ёсць у нас і паэты, і мастакі, і разьбяры.

ДАДАТАК 2

План работы лектарскай групы

| | | | |
|---|---|---|---|
| 01.10 | Да Дня настаўніка | Багушэвіч – Доцішкаўскі настаўнік | для настаўнікаў |
| 14.10 | Да дня Маці | “Жанчыны ў сям’і Бугушэвіча” | для 7,8,9 кл. |
| 10.12. | | Багушэвіч у Канатопе | для 10-11 кл. |
| 28.01. | | Багушэвіч у Пецярбургу | для 9 кл. |
| 16.02. | | Сям’я Багушэвіча (браты, сястра) | для настаўнікаў |
| 21.03. | Да 172-гадавіны паэта | Багушэвіч у Свіранах | для 9,10,11 кл. |
| 18.05. | Да Міжнароднага дня музеяў | Гісторыя стварэння музея Ф.К. Багушэвіча (прэзентацыя) | для настаўнікаў і вучняў |

ДАДАТАК 3

Матэрыялы для лектарскай групы

Багушэвіч у Кушлянах



***НА РАДЗІМЕ БАГУШЭВІЧА***

Нам бясконца дарагія мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю выдатных пісьменнікаў, якія чэрпалі сваё натхненне з крыніц народнай культуры. Адно з такіх Кушляны – месца, дзе прайшлі дзіцячыя, юнацкія і апошнія гады Францішка Багушэвіча. Яскравы прадстаўнік крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры XIXст., аўтар “Дудкі беларускай” займае асаблівае месца ў гісторыі Беларусі. Яго творчасць накіравана супраць буржуазнай рэчаіснасці і адыграла значную ролю ў справе абуджэння самасвядомасці і нацыянальнай самабытнасці беларусаў, абаронцам якіх быў не толькі ў сваім палымяным слове, але і на працягу ўсёй шматгадовай  юрыдычнай практыкі. Усёй душой паэт служыў свайму народу, з яго вуснаў збіраў паданні, казкі, песні і байкі. Таму пісаў і гаварыў на багатай народнай беларускай мове.

Як сапраўдны мастак, Ф.Багушэвіч уражвае паэтычным майстэрствам, гуманізмам, узвышанай прастатой, моцным пачуццём павагі і любові да народа, шчыльнай повяззю з роднай зямлёй. Паэт і Беларусь – два непадзельныя паняцці. Менавіта Бацькаўшчына фарміруе светапогляд, грамадзянскую пазіцыю і эстэтыку пісьменніка. Лёс Францішка Багушэвіча цесна звязаны з Віленшчынай, Ашмяншчынай, Смаргоншчынай і іншымі мясцінамі Гродзеншчыны. Яго радавы маёнтак Кушляны (цяпер у Смаргонскім раёне) у 18 вярстах ад павятовага горада Ашмяны, 8 – ад валаснога праўлення ў Жупранах, 6 – ад станавой канторы, 15 – ад чыгуначнай станцыі Солы. Гісторыя маёнтка ўзыходзіць да XVIII ст. Прапрадзед паэта Антось у 1749 г. набыў маёнтак Кушляны за 450 польскіх злотых. У 1768 г. ён завяшчаў яго сваім сынам Бенядыкту і Казіміру. Потым Кушляны перайшлі да Казіміра, а ад яго – у спадчыну дзеду будучага пісьменніка Язэпу. У 1800 г. у Язэпа Багушэвіча паявіўся сын Казімір – бацька паэта.

Нарадзіўся паэт ў Свіранах. Метрыка сведчыць, што Францішак , сын Казіміра Багушэвіча, нарадзіўся 9 сакавіка 1840 года ў фальварку Свіраны Віленскага павета і быў ахрышчаны ў Рукойненскім парафіяльным касцёле. У Кушлянскай сядзібе Багушэвіч пражыў да паступлення ў Віленскую гімназію. (1852г.)

Скончыўшы яе ў 1861 г., Францішак паступае ў Пецярбургскі ўніверсітэт з мэтай вывучэння матэматычных і натуральных навук. Пасля двух месяцаў вучобы ён звальняецца пад афіцыйнай маркай па стане здароўя. Трэба меркаваць, што пакінуў ён навучанне ва ўніверсітэце вымушана, з-за ўдзелу ў студэнцкіх хваляваннях увосень 1861 г., пасля якіх 14 лістапада і было пададзена прашэнне аб звальненні. Аднак удзел Багушэвіча ў хваляваннях не быў заўважаны ўладамі, бо, задавальняючае яго прашэнне, пецярбургскі обер-паліцмайстар А. У. Паткуль, праз чые рукі праходзілі справы, звязаныя са студэнцкімі хваляваннямі, характарызаваў Багушэвіча, як “паводзін вельмі добрых”. Неўзабаве і хвароба (тыф) сапраўды вымушае Францішка вярнуцца ў Кушляны.

Цяжкае становішча бацькавай гаспадаркі, нястача прымусілі яго шукаць працу. Ён накіроўваецца ў вёску Доцішкі Лідскага павета, дзе настаўнічае ў тутэйшай школе, адчыненай багатым і адукаваным ліберальным панам А. Звяровічам, пазнейшым удзельнікам паўстання 1863 г. Відаць, тут паэт і далучыўся да паўстанцкага атрада, у якім і быў паранены ў нагу ў Аўгустоўскіх лясах.

Трэба меркаваць, што бацька Францішка не падзяляў яго палітычных поглядаў, таму што на следстве аб паўстанні 1863 г. ён паказвае на Францішка як на мяцежніка. Сучаснікі паэта падкрэслівалі, што і сярод сваіх яго не пакідаў смутак. Не пажадаў Мацей Бурачок падаць у беларускі музей біяграфію бацькі, бо генерал-губернатар М. Мураўёў-вешальнік загадам ад 10 мая 1864 г.вызначыў лёс жыхароў сядзібы: “Дворян Ошмянского уезда… Казимира Багушевича, его сына Аполлинария, дочь Анну… оказавшимися виновными в сношениях с мятежниками и доставлении им сведений предать военному суду по полевому уголовному положению”. Бацьку Багушэвіча абвінавачвалі ў тым, што “оказался… виноватым в слабом надзоре за детьми, из коих двое сыновей находилось в мятежнической шайке, а дочь… имела сношения с мятежниками”. За ўдзел Багушэвіча ў паўстанні 1863 г. начальнік Віленскай губерні патрабаваў секвестрацыі маёнтка Кушляны. Насуперак гэтаму часовы палявы аўдытарыят вызваліў маёмасць Багушэвіча ад секвестра і падверг Казіміра штрафу ў 100 руб., а дачку Ганну гадавому ўтрыманню пад арыштам. Удзел брата пісьменніка Апалінарыя ў паўстанні не быў даказаны. (Бацька пісьменніка памёр 29 лістапада 1884г.)

Перачакаць ліхалецце дапамаглі Францішку сябры. З іх дапамогай у 1865г. паэт перабраўся ў Нежын Чарнігаўскай губерні, дзе з адзнакай скончыў юрыдычны ліцэй князя Безбародкі і атрымаў прафесію юрыста. З 1866 г. служыў судовым следчым у Чарнігаўскай і Валагодскай губернях. У Канатопе ў 1874 г. Багушэвіч ажаніўся з Габрыэляй Шклёнік, родам з Мінска. Праз дзесяць гадоў падае ў адстаўку і пераязджае ў Вільню – культурны цэнтр ўсяго Паўночна-Заходняга краю. Тут уладкоўваецца на пасаду адваката пры

Віленскім акруговым судзе. Менавіта з гэтага часу Багушэвіч пачынае сур'ёзную літаратурную працу, якой дагэтуль займаўся спарадычна. Тут, у спрадвечным асяродку беларускай, літоўскай і польскай інтэлігенцыі, узмацняюцца яго літаратурна-творчыя сувязі з буйнымі пісьменнікамі і вучонымі Э. Ажэшкай, А. Ельскім, М. Федароўскім, Я Карловічам і інш.

Служба не прынесла Багушэвічу багацця, таму ён быў вымушаны пакінуць яе з-за "… скудности средств для удовлетворения служебных и жизненных потребностей, потеряв и надежду дожить более удовлетворительных условий". У 1896 г. ён нечакана атрымаў спадчыну памёршага сваяка, што дазволіла яму пакінуць у 1898 г. службу і асесці ў родным маёнтку Кушляны. Багушэвіч аднаўляе разбураную арандатарамі гаспадарку і будуе дом, у якім і праводзіць апошнія гады жыцця. Вельмі цяжка ён перанёс страту дачкой Канстанцыяй голасу, якая вучылася спяваць за мяжой і выступала ў вядомым міланскім тэатры Ла Скала. Спачыў паэт 15 красавіка 1900 года. Так скончылася шасцідзесяцігадовае, поўнае цяжкасцяў і расчараванняў, слёз і смутку, жыццё. Пахаванне адбылося каля велічных муроў Жупранскага касцёла Пятра і Паўла, збудаванага ў стылі неаготыкі ў 1854 – 1890 гг. Тут, ля касцёла, на магіле ў 1975 г. устаноўлена стэла з барэльефам паэта. На плошчы ў Жупранах у 1958 г. пастаўлены помнік паэту.

Славуты пісьменнік выйшаў са збяднелай шляхецкай сям'і. Аб яе абмежаваных матэрыяльных здольнасцях сведчыць ужо тое, што Францішку прыйшлося хадайнічаць аб бясплатным навучанні ў Віленскай гімназіі. Аналагічную заяву вымушаны падаць і рэктару Пецярбургскага ўніверсітэта: "Не имея решительно никаких материальных средств, ни посторонней помощи прибегаю к вашему превосходительству со всепокорнейшей просьбой от увольнения меня от установленной платы 50 рублей за право учения". Даводзілася неаднаразова адказваць і сваё дваранскае паходжанне. Упраўляючы навучальнай акругай князь А. П. Шырынскі-Шахматаў дазваляе выдачу Багушэвічу атэстата аб сканчэнні Віленскай гімназіі толькі "…по предоставлении формальной копии с определения депутатского собрания о

дворянском происхождении”. Толькі калі быў прадстаўлены такі дакумент, Багушэвічу выдалі атэстат з правам на чын XVI класа – калежскага рэгістратара – ніжэйшая пасада ў грамадзянскай чыноўніцкай службе ў царскай Расіі. Дастатку сям’і Багушэвічаў адпавядала і іх невялікая сядзіба ў Кушлянах.

Кушляны – тыповая дробнапамесная беларуская сядзіба. У 1863 г. маёнтак уключаў да 200 дзесяцін ворнай, сянажнай і лясной зямлі. Пры доме мелася 5 чалавек прыслугі, фурман коннага экіпажа. На 1905 г. жыхароў мелася 25, з якіх 12 мужыкоў і 13 жанчын. З паўночна-ўсходняга боку сядзіба Багушэвіча межавалася з маёнткам Маркоўскага (пазней Альхімовіча).

Першапачаткова сям’я Багушэвічаў жыла ў старой афіцыне, што мясцілася ніжэй на схіле дома. На яе месцы засталіся парослыя пустазеллем замшэлыя падмуркі фундаментаў. Драўляны дом пабудаваны паэтам пасля вяртання яго ў маёнтак. Ф. Багушэвіч узводзіць дом у народным стылі. Вось як ён апісвае яго ў вершы “Мая хата”:

Бедна ж мая хатка рассеялася з краю
Між паяскоў, каменняў , ля самага гаю,
Ля самага бору, на беражку лесу;
Ніхто тут не трафе, хоць бы з інтарэсу,
Як няма гарэлкі, няма куска хлеба,
Дык які ж інтарэс, каму сюды трэба?
Да хоць няма хлеба, жабраваць ня буду,
Пражыву як кольвек ад працы, ад труду!

Першапачатковы выгляд дома бачым на гравюры 1929 г. У адпаведнасці з ёй сядзібны дом Багушэвічаў дайшоў да нас амаль у нязменным выглядзе. Немудрагелісты па архітэктуры аднапавярховы будынак вылучаецца ад сялянскіх хат амаль што большымі памерамі і вышынёй даху. Дом рублены ў адзін зруб (10 × 15 м) з чэсаных сасновых бярвенняў. Прамавугольная ў плане аднапавярховая пабудова накрыта высокім двухсхільным дахам (першапачаткова гонтавым, цяпер – шыферным). Галоўны паўднёва-ўсходні фасад меў адкрытую пабудову – навісаючую страху на слупках. Уваходы ў дом

былі арганізаваны праз двое бакавых сенцаў, у якія пападалі з веранды. Паўночна-ўсходнія сенцы мелі два ўваходы: адзін – з веранды, а другі – непасрэдна з вуліцы. Гэта было жаданне ізаляваць уваход, які вядзе з вуліцы на кухню. Па баках веранды – два драўляныя ганкі. Дом першапачаткова быў ашаляваны, а ўнутры атынкаваны па дранцы. Дзверы з надворку былі шчытавыя, абшытыя "вагонкай" "у елку". У сенцах – прамавугольныя вокны з простымі ліштвамі, якія мелі прафіляваныя перамычкі.

Спрошчана вырашана і планіроўка дома. Унутранай з бярвення сцяной ён падзелены на дзве паловы і шэсць узаемазвязаных, прыкладна аднолькавых па плошчы пакояў. Сцены былі выклеены шпалерамі, падлога паркетная, столь падшыўная, пабеленая, дзве галандскія грубкі і кухонная руская печ прыдавалі ўтульнасць яго хаце. Любіў паэт пабавіць вечары каля каміна, пакоі былі абсталяваны мэблевымі гарнітурамі. Пад домам быў зроблены склеп-сховішча, уваход у які ажыццяўляўся праз кухонныя сенцы.

Два гаспадарчыя будынкі размешчаны паасобку ў паўднёва-заходняй частцы сядзібы. Адзін з іх выкладзены з бутавага каменя-валуна, якога спрадвеку шмат у наваколлі, другі – зрубны. (Найбольшую цікавасць уяўляе драўляны свіран, што размешчаны ў паўночна-ўсходнім баку ад сядзібы, у былым маёнтку Альхімовіча. Гэты будынак – тыповы прыклад сялянскага свірана з падклеццю. Двух'ярусны квадратны ў плане зруб завершаны двухсхільным дахам і з фасаду мае слупавую галерэю.)

Паводле успамінаў унучкі паэта Станіславы Тамашэўскай, якія адносяцца да 1910 – 1920 гг., на тэрыторыі сядзібы размяшчаліся дзве студні з "жураўлямі". Адна з іх знаходзілася насупраць сажалкі, ля плоту.

У памяць аб падзеях 1863 – 1864 гг. была пастаўлена прыдарожная каплічка. З успамінаў унучкі паэта З. Абрамовіч вядома, што пры каплічцы знаходзілася і ўязная брама. Тэрыторыю сядзібы акружала драўляная агароджа. Перад домам быў створаны паўкруглы кветнік. Непадалёку ад яго рос пасаджаны пісьменнікам вяз.

Невялікі, але ўтульны парк – дэкаратыўныя дрэвы і яблыневы сад – высаджаны па распаўсюджанай у другой палове XIX ст.”эканамічнай” планіровачнай схеме. Сад складаўся з 12 радоў дрэў з размешчанымі паміж імі вуллямі. Па ініцыятыве паэта ля падножжа сядзібнага ўзгорка была выкапана сажалка. Да яе вяла сцежка, абсаджаная кустамі агрэсту і парэчак. За сажалкай да самага лесу цягнуліся палі і лугі. З паўночна-ўсходняга боку парк абмяжоўвала купа старых ліп і арэшніку. З паўночна-заходняга боку тэрыторыя сядзібы агароджана жардзяным плотам, у які былі ўбудаваны каплічка і брама. За плотам праходзіла дарога. На захад ад сядзібы пасаджаная яшчэ Францішкам алея з бэзу і каштанаў. Па гэтай алеі брат паэта Апалінарый і сястра Ганна насілі грошы і страву паўстанцам, якія хаваліся ад царскіх жандараў у суседнім гаі. Алея вядзе да так званай Лысай гары, на якой стаяла альтанка.

У канцы алеі, на невялікай палянцы пад узгоркам, спрадвеку ляжыць замшэлы камень-валун, які наведваў паэт, калі меў намер сам-насам паразважаць аб жыцці-быцці. На камяні надпіс “Памяці Мацея Бурачка”.

На краі парка, у засені старых лістоўніц, стаіць невялічкая альтанка, зробленая рукамі паэта. Яна ўяўляе сабой звычайны шатровы гонтавы навес на чатырох слупах і забрукаваную пляцоўку, абгароджаную частаколам. У гэтым немудрагелістым збудаванні, як і ва ўсёй сядзібе, праявілася цяга паэта да народнага дойлідства. Адзначым, што рабіў ён яе ў час, калі ва ўсіх прыватнаўласніцкіх сядзібах расцвітала архітэктурная эклектыка, узводзіліся экзатычныя “гатычныя” замкі і інш.

Некалі сфарміраваная ў адзіны архітэктурна-паркавы ансамбль сядзіба дайшла да нас у некалькі змененым выглядзе. Дом, у якім доўгі час размяшчалася Кушлянская сельская бібліятэка імя Ф. Багушэвіча, таксама атрымаў нязначныя змены. Падсадкі патрабуе парадзелы парк, поўнасцю знік яблыневы сад, расчысткі чакае высахлая сажалка. Знікла ўся агароджа з каплічкай і брамай, у цяжкім стане і альтанка паэта. Вярнуць сядзібе першапачатковае аблічча закліканы праект рэстаўрацыі, што распрацаваў архітэктар В. Слюнчанка. Паводле праекта прадугледжваецца комплексная

рэканструкцыя і аднаўленне сядзібы. У гэтым гісторыка-архітэктурным помніку размесціцца Літаратурны музей Ф. Багушэвіча. Наведвальнікі змогуць азнаёміцца з характэрным побытам дробнапаместнай сядзібы другой паловы XIX ст. У гаспадарчых будынках плануецца разгарнуць этнаграфічную экспазіцыю, якая б адлюстроўвала сялянскі побыт беларускай вёскі. Архітэктурны ансамбль сядзібы значна ўзбагачае свіран, што захаваўся на ўскраіне вёскі Кушляны. Тыповы і для сялянскай, і дробнапаместнай гаспадаркі, ён добра дапоўніў бы тую этнаграфічную экспазіцыю, якую збіраюцца тут стварыць. На жаль, архітэктары не ўлічылі гэтую акалічнасць.

Багатая літаратурная спадчына Францішка Багушэвіча – буйны помнік беларускай культуры. Разам з ёй і любыя факты жыццёвага і творчага шляху паэта, яго рэчы, дарагія для нас, бо яны з'уляюцца адначасова арганічнай часткай нацыянальнай культуры. У гэтай сувязі рэстаўрацыя сядзібы ў Кушлянах стане своеасаблівым укладам у справу зберажэння і прапаганды нашай культурнай спадчыны.

Гісторыя заснавання літаратурнага музея Ф.К.Багушэвіча

(прэзентацыя)

Мо, не кожны куточак той знае,
Дзе ў далёкія змрочныя дні
Жыў пясняр, што хацеў,
Каб над краем засвяціліся шчасця агні.

Ён хацеў змайстраваць песню-дудку,
Каб казала народу яна
Пра галечу яго і пакуты,
Каб грымела, як гнеў перуна.

Такім песняром для беларусаў стаў Францішак Багушэвіч, наш зямляк, паэт-дэмакрат.

1 блок “Гісторыя стварэння музея.”

У Жупранах даўняя,
Добрая традыцыя:
Помніць Багушэвіча,
Помніць, ганарыцца.

Літаратурны музей Ф. К. Багушэвіча быў адкрыты 22 сакавіка 1970 года па ініцыятыве дырэктара школы Міхаіла Іосіфавіча Крайнова і настаўніка роднай мовы і літаратуры Канстанціна Аляксеевіча Кадыркі. Так напружаная праца на працягу 15 гадоў закончылася добрай справай – адкрыццём музея.

Шчыравалі гуртам,

Дружна і натхнёна
Дзеці і дарослыя,
Мэтай акрылёныя.

Земляка-паэта
Шануючы свята,
У музей збіралі
Рэчы, экспанаты.

А ў сямідзесятым
Наш музей адкрыўся.
Да тае падзеі
Шмат хто далучыўся.

Першая экспазіцыя музея размясцілася ў старым будынку Жупранскай школы ў невялікім пакойчыку.

Першым экскурсаводам у адкрытым музеі была вучаніца 10 класа Софія Паўлоўская. Зараз яна дырэктар нашай школы.

На свята адкрыцця музея з’ехалася многа гасцей. Сярод іх былі беларускія паэты і пісьменнікі, кіраўнікі раёна і вобласці, прыйшлі мяцовыя жыхары.

Былі госці з Мінска,
Людзі з іншых месцаў,
Дзеячаў, пісьменнікаў
Сустрэлі чэсць па чэсці.

Правялі ўрачыстасць
На такім узроўні,

Што ўсе ў задавальненні
Засталіся поўным...

Год 1976. Снежань месяц. Юныя жупранцы і іх настаўнікі атрымалі ў дарунак ад дзяржавы светлы, прасторны будынак новай школы. Сюды, у новую школу “пераехаў” і музей і размясціўся ў прасторнай зале. Афармлялі новую экспазіцыю мастакі Святаслў Палівода і Генадзь Селядзец. Сродкі на аплату ўсіх работ выдзеліў Ашмянскі раённы аддзел адукацыі, на чале якога тады стаяў Іван Іванавіч Германчук. За вялікі ўклад у работу па стварэнні музея Кадырку К. А. была ўручана Ганаровая грамата  Ашмянскага райвыканкама.

Год ішоў за годам –
Дзеці выраслі,
Пакідалі школу,
На ногі ўставалі.

Разам з дзецьмі рос і шырыўся наш музей. Новыя павевы часу навеялі патрэбу ў абнаўленні экспазіцыі музея. І вось у 1990 годзе,  дзякуючы старшыні калгаса імя Багушэвіча Вацлаву Францавічу Ждановічу, які выдзеліў сродкі, музей набыў новы воблік. Кіраваў работай даследчык творчасці Багушэвіча Уладзімір Содаль. Да 150-годдзя з дня нараджэння паэта абноўленая экспазіцыя адчыніла свае дзверы для гасцей.



Пошукавай работай, якая вядзецца ў музеі, займаецца савет музея. У састаў савета ўваходзяць вучні старэйшых класаў.

Уся пошукавая дзейнасць вядзецца па некалькіх накірунках:

- Экскурсійная работа.
- Даследаванне і адкрыццё невядомых старонак жыцця і дзейнасці
  - Ф. Багушэвіча.
- Навукова-даследчая работа па вывучэнні гісторыі школы і в. Жупраны.
- Даследчая работа па вывучэнні жыцця і дзейнасці знакамітых землякоў.
- Арганізацыя фальклорных свят, літаратурных гасцёўняў, сустрэч з цікавымі людзьмі.
- Выпуск рукапіснага часопіса “Пралеска.”

II блок “Славутыя госці, якія наведалі наш музей у розныя часы”

У музей, у школу,
К помніку паэту
І ідуць, і едуць
З розных старон свету.

Самай дарагой наведвальніцай нашага музея была Станіслава Тамашэўская, малодшая з трох унучак Багушэвіча. Яна прыехала з Польшчы і падаравала музею збор твораў Элізы Ажэшкі.

Станіслава Тамашэўская, на долю якой выпаў цяжкі лёс пасля 1939 года, была вельмі здзіўлена тым, што жыццё на яе Радзіме з кожным годам паляпшаецца, і асабліва тым, як ушаноўваюць землякі памяць яе “дзядка”.Для госці ў мясцовым клубе наладзілі ўрачыстую вечарыну. Пасля яна разам з мужам Станіславам, Адамам Мальдзісам і Міхаілам Іосіфавічам Крайновым на фурманцы паехала ў Кушляны, на радзіму дзеда.

Частым госцем нашага музея бывае Уладзімір Содаль, рупліўца, даследчык жыцця і  творчасці Ф. Багушэвіча. Дзякуючы яму, мы маем шэраг публікацый у часопісе”Роднае слова” ў рубрыцы “З Кушлянскага кута”, кніжачкі “Жупранская старонка” і “Кушлянскі кут”.

У розныя гады наведалі наш музей і пакінулі ў дар свае кнігі з аўтографамі Ніл Гілевіч, Данута Бічэль, Адам Мальдзіс, Мар’ян Дукса, Ларыса Геніюш. У экспазіцыі маем ліст Ларысы Геніюш да вучняў школы. Данута Бічэль у сваіх вершах не абмінула ўвагай і Жупраны, і Багушэвіча.

У матэрыялах музея ёсць цікавыя ўспаміны Заіра Азгура пра яго работу  над помнікам Ф. Багушэвічу, які ўстаноўлены ў Жупранах у 1958 годзе. Паводле ўспамінаў Азгура, вельмі прыязна прыняў Багушэвічаў бюст Якуб Колас, які яшчэ пры жыцці застаў гэту работу на самым яе пачатку. Ён сказаў: “ Зроблена, як робяць сапраўдныя майстры. Тут перададзена не толькі знешняе, але і ўнутранае падабенства.”

Пётр Іосіфавіч Бусловіч, былы настаўнік Ашмянскай школы глухіх дзяцей, выразаў з дрэва і падараваў музею бюст Багушэвіча.

Жолуд Анатолій Фаміч, былы настаўнік чарчэння і  малявання Жупранскай школы, даволі ўдала напісаў партрэт паэта. Абедзве гэтыя работы выкананы на высокім мастацкім узроўні.

Яшчэ адзін госць нашага музея Сцяпан Александровіч пасля сустрэчы з вучнямі і настаўнікамі, гутаркі з імі пра Багушэвіча, пра жупранскую зямлю сказаў такія словы: “Тут зямля такая...” І змоўк, пакінуўшы ўсіх у роздуме. “ А якая тут зямля?” А адказ на гэта пытанне просты: наша зямля багатая на таленавітых людзей. Ёсць у нас і паэты, і мастакі, і разьбяры. Гэта значыць, што для нас ёсць поле для даследчай дзейнасці.

III блок "Таленавітыя людзі Жупраншчыны"

Ніл Гілевіч у рамане "Родныя дзеці " напісаў такія радкі:

...Нам не з зямлі сыходзіць цяжка,
А з добрай памяці людской.

Калі б ды так! Калі б ды кожны
З маленства думаў, з першых лет:
Які – ці светлы, ці прыгожы –
Пакіне ў памяці ён след!

Трэба думаць, што памяць пра Багушэвіча жыве ў яго вершах, а таксама ў справах тых людзей, якія свята ўшаноўваюць памяць свайго земляка ў сваіх творах. Багата на таленты наша маленькая Радзіма.

Закранаюць душу і выхоўваюць лепшыя пачуцці вершы Анатоля Вішнеўскага, які вельмі любіў нашу школу, з задавальненнем наведваў музей. Таленавіты, улюбёны ў сваю зямлю, у жыццё, у людзей, ён ішоў да чытачоў з адкрытым сэрцам. Матывы яго лірыкі разнастайныя: то лірычныя, то задуменныя, то сур'ёзна-шчымлівыя, то разважлівыя.

Не забывай, што ты чалавек,
Век твой кароткі, імгнення век.
Па чалавечых і Божых законах жыві,
Не забывай, што ты чалавек.

.........................

Мой светлы дзень, ты зноў прайшоў,
Адрэзаны кавалачкам жыцця.
Адпета песня маладых вятроў,
І ўсё бліжэй заслона небыцця.

І ўсё мілей становіцца мой дом,
І твары блізкіх мне ўсё даражэй.
Чаруе восень за маім акном,
Ды за вясну яна мне ўжо мілей.

І сцеліць мне дарогу лістапад,
Дарогу, што вядзе ў халодны край.
Жыццю свайму, якому быў так рад,
Тады скажу апошняе “Бывай”.

Ён пайшоў з жыцця ў поўным росквіце сіл, на 41-м годзе жыцця. А для нас пакінуў загадку, якую сам не паспеў разгадаць: ён меркаваў, што з’яўляецца далёкім сваяком Багушэвіча. Спадзяёмся, што калі-небудзь нам удасца знайсці разгадку.

Гонар за нашу Радзіму і яе слаўных людзей гучыць у вершах Пятра Валяр’янавіча Шаколы. У паэта свой асабісты стыль, надзвычай просты і, магчыма, таму такі непаўторны і блізкі сэрцу. Не абмінуў ён у сваіх вершах і Жупраны, і Багушэвіча.

На жупранскай на старонцы
Хораша, цікава.
Там такія краявіды –
Словам не раскажаш!

Трэба з’ездзіць мне ў Жупраны –
Там і Пілiканка,
І касцёл Пятра і Паўла,
І музей у школе...

Я паеду ў Жупраны –
Там наш Багушэвіч
Пралажыў сваю сцяжыну
І знайшоў спачынак.

Многа гадоў назад Пётр Валяр'янавіч працаваў у нашай школе.

Багатая на таленты жупранская зямля. Члены савета музея зацікавіліся творчасцю самабытнага мясцовага паэта (ён родам з вёскі Лусцішкі) Эдуарда Іванавіча Шукяловіча. Гэта ўжо сталы чалавек. Усё жыццё працаваў на зямлі, а ў вольны ад работы час пісаў вершы пра аднавяскоўцаў, пра калгас. Вершы простыя, падобныя да частушак, выклікаюць добрую ўсмешку, падымаюць настрой.

Над рэчкай Ашмянкай-
Лясныя зацішкі.
Стаіць наша вёска
З назвай Лусцішкі.

Стаіць гадоў многа,
Яшчэ стаяць будзе.
Жывуць у нашай вёсцы,
Добрыя людзі.

Стаіць наша вёска
Блізка ля броду.
Жыве ў нашай вёсцы
Ахоўнік прыроды.

Адны ўслаўляюць свой край ў вершах, другія – у жывапісе. Такой творчай асобай з'яўляецца Уладзімір Францавіч Шымановіч. Працуе ў нашай школе настаўнікам выяўленчага мастацтва і працоўнага навучання. А ў вольны час

захапляецца жывапісам. Пра Уладзіміра Францавіча студыяй СТВ Беларускага тэлебачання створаны фільм.

Толькі ў сапраўды ўлюбёнага ў свой край чалавека могуць атрымацца такія цудоўныя карціны.

Можна назваць многія імёны жупранцаў, якія ў розны час рабілі спробы пяра. Гэта і Віктар Шукяловіч, выпускнік нашай школы, закончыў аспірантуру пры БДУ. Людміла Козел зараз настаўніца Ашмянскай гімназіі, таксама наша выпускніца.

А тыя нясмелыя спробы пяра нашых цяперашніх вучняў...Магчыма, таксама нехта з іх будзе пісаць вершы і друкавацца ў беларускіх выданнях. А пакуль свае вершы яны змяшчаюць у школьным рукапісным зборніку "Пралеска".

IVблок "Літаратурны музей – цэнтр выхаваўчай работы"

Літаратурны музей Ф.К. Багушэвіча – гэта не толькі месца, куды ідуць і едуць "з розных старон свету..."

Маладыя і сталыя,
Вучні і студэнты,
Просты люд працоўны
І інтэлігенты.

Кожны з іх імкнецца
Паглядзець мясціны-
Там, дзе Багушэвіч,
Наш свой след пакінуў.

Наш музей – цэнтр выхаваўчай работы, патрыятычнага выхавання. А выхоўваць, як вядома, можна не толькі словам, але і справай.

Традыцыяй стала правядзенне экскурсій для тых вучняў, якія толькі ўступаюць у школьнае жыццё. Ды і вучні старэйшага ўзросту з задавальненнем заходзяць у музей, каб даведацца нешта новае пра паэта.

У музеі праводзяцца зборы, калі вучняў прымаюць у піянеры.

З задавальненнем дзеці ўдзельнічаюць у фальклорных святах, якія праводзяцца на базе музея.

Немалую цікавасць у вучняў выклікае ўдзел у раённым конкурсе "Галасы гісторыі", на якім мы неаднаразова займалі прызавыя месцы. Трэба адзначыць, што актывісты савета музея для гэтага конкурсу заўсёды рыхтуюць якое-небудзь народнае свята.

Любяць дзеці і інтэлектуальныя гульні. Вось нядаўна прайшла гульня "Вандроўка па родным краі", у якой спаборнічалі зборныя каманды з 9' і 11' класаў. У мінулым годзе вучні падрыхтавалі вусны часопіс з прэзентацыяй "Ты жывеш у Беларусі".

Некаторыя ўрокі гісторыі, роднай літаратуры настаўнікі праводзяць у музеі, выкарыстоўваюць экспанаты з этнаграфічнага кутка на пазакласных мерапрыемствах.

Пра Багушэвіча напісана і сабрана матэрыялу вельмі многа, але застаюцца яшчэ цікавыя звесткі. Вось, напрыклад, нядаўна мы даведаліся, што жыве ў Мінску юнак Васіль Зелянкоў, які лічыць сябе далёкім сваяком Багушэвіча. Ён

сцвярджае, што той дар пісьменніка, якім яго надзяліў лёс, ад тых Багушэвічавых генаў. Так гэта ці не, нам яшчэ давядзецца дазнацца.

Дзякуючы знаёмству з вучнямі беларускамоўнай школы імя Францыска Скарыны г. Вільні, якія наведвалі наш музей, мы атрымалі магчымасць звязацца з Таварыствам беларускай мовы, якое дзейнічае ў Вільні. На наш ліст мы атрымалі адказ ад Юрыя Гіля, старшыні Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны Віленскага краю, у якім ён паведаміў, што на Радзіме Багушэвіча ў Свіранах кожны год у апошнюю суботу траўня праводзяцца мерапрыемствы ў гонар паэта, створаны своеасаблівы мемарыял: ля крыжа пастаўлена фігура Маці Божай Свіранскай. У Вільні ў 2006 годзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка на будынку, дзе некалі быў Віленскі акруговы суд, у якім Багушэвіч працаваў адвакатам. У вёсцы Савічуны, што паблізу Свіран, адна з вуліц носіць імя паэта.

Вялікую цікавасць у вучняў і настаўнікаў школы выклікала збіранне матэрыялаў для этнаграфічнга кутка "Інтэр'ер беларускай хаты 19ст". Тут сабраны прадметы побыту беларускага сялянства той эпохі, калі жыў Багушэвіч. Мы ганарымся тым, што і часцінка нашай працы ўкладзена ў збор экспанатаў для кутка.

Многа зроблена, але работа ў музеі працягваецца. Зараз збіраецца матэрыял па гісторыі Жупран. Ужо падрыхтавана прэзентацыя з тых матэрыялаў, якія сабраны.

Вялікую цікавасць да Жупранскай старонкі і нашага музея праяўляюць карэспандэнты рэспубліканскіх газет і Беларускага радыё. Апошняя публікацыя "На беразе хуткай Ашмянкі" была надрукавана ў "Настаўніцкай газеце" за красавік 2008 года. Аўтар яе Ігар Грэчка.

Гісторыя Жупранскай старонкі багатая і разнастайная. Нам ёсць яшчэ што вывучаць і даследаваць.

ДАДАТАК 5

Тэатралізаваная экскурсія па літаратурным музеі
Ф.К. Багушэвіча

Там, дзе сонца яснае
Сядае за лясы,
Ёсць мястэчка дзіўнае
Цудоўнае красы.
З 15 стагоддзя ў летапіс вякоў
Жупранскае паселішча ўпісалі з тых гадоў.

Князь Вітаўт правіў ім
І ваявода Мовід,
І Радзівілаў род
Гаспадаром быў 300 год.

І назву мела гучную мястэчка:
Жупранскім графствам звалася яно.
З ракой Ашмянкай, пушчаю лясною
Нібыта ў казцы тут жыццё ішло.

Мо, не кожны куточак той знае,
Дзе ў далёкія змрочныя дні
Жыў пясняр, што хацеў,
Каб над краем засвяціліся шчасця
агні.

Ён хацеў змайстраваць песню-
дудку,

Каб казала народу яна
Пра галечу яго і пакуты,
Каб грымела, як гнеў перуна.

*Такім песняром для беларусаў стаў Францішак Багушэвіч, наш зямляк, паэт-дэмакрат.*

У Жупранах даўняя,
Добрая традыцыя:
Помніць Багушэвіча,
Помніць, ганарыцца.

*Жыццёвы шлях Ф. К. Багушэвіча цесна звязаны з Жупранамі. Ён з сям'ёй часта бываў у Жупранах на кірмашах, якія ладзіліся на рыначнай плошчы, у мясцовым касцёле Пятра і Паўла на фэстах. У час паўстання 1863 года выступаў перад сялянамі на плошчы з заклікамі да зброі за зямлю і волю.*

Ты, народ мой, - не слабы!
Дзецюкі! Слязу сатрыце,
для вялікае касьбы
свае косы навастрыце!
Біце ў звон ва ўсе канцы
ў непахіснасці і веры.
Сёння вы яшчэ касцы,
Заўтра вы – касіянеры.
Заўтра – з крыўдай змагары,
ганьбаю, жыццём ярмовым
і, Бог дасць, гаспадары
і зямлі сваёй, і мовы.

*На кліч Каліноўскага змагацца за гонар і волю адгукнулася і сям'я Багушэвічаў. З паўстанцамі былі бацька, дачка Ганна і тры сыны. Сярод іх – і Францішак, які падчас адной з сутычак паўстанцаў з царскімі карнікамі быў паранены ў нагу.*

Не на сцяжыну вузкую
выходзілі дзецюкі,-
шляхцічы беларускія,
браты мае – мужыкі!
Не на бяседу стольную, -
песняй будзіць абшар,
а за Айчыну вольную,-
з ворагам – твар у твар.
Можа, не ўсе мы вернемся
кожны на свой парог,
але няма наперадзе
іншых у нас дарог.
Падрыхтаваны вісельні,
і навакол віжы.
Можа, не ўсе мы выстаім,
але Беларусі – жыць!

*Пасля разгрому паўстання хату Багушэвічаў пакінулі адразу два сыны: 24-гадовы Францішак і 23-гадовы Валяр'ян.*
*Самаго гаспадара з дзецьмі – адзінай дачкою Ганнай і наймалодшанькім Апалінарам – больш за год трымалі ў турме пад следствам.*

***Гучыць "Паланэз" М. Агінскага. На фоне мелодыі дзяўчына, што сядзіць ў крэсле ля свяцільні, гаворыць словы:***

***Дзяўчына*** *На доўгіх 20 гадоў пакінуў Багушэвіч Беларусь, доўгіх 20 гадоў марнеў ён ад настальгіі ў чужых краях.*

Багушэвіч (устае з-за стала)
Умёр бы, то, мусіць, я тут,
Каб не жменька той роднай зямлі.
Як пачне разбіраць і мяне,
Дык шчыкну яе ў вадзе.
Глынеш, дык пот аж ліне,
І хваробу рукой развядзе!
А другім што даваў, дык і не!
Не памог і не шкодзіў нікому,
Бо зямля не па іх, а па мне.
Значы, трэба зямлі мець, каб з дому
Яна давяла і дадому мяне,
Бо і ёй на чужой старане
Так не хочацца быць, як і мне.

***Далей гучыць "Паланэз". На фоне музыкі словы.***

*Як птушка з выраю, ён рваўся на Радзіму... Можа, тады ён і сам не ведаў, на якія вышыні вось-вось узаўецца.Не шабля водблескам сонца заззяе ў яго руках, не вогненны сполах карабіна асвеціць яго мужны твар. Загалосіць, заплача ў яго руках дудка беларуская, зазвоніць, разане па душах землякоў смык. Гэта будзе ўзвышэнне над абставінамі, узвышэнне, якое дасць Радзіма.*

***25*** *сакавіка 1884 года, на Звеставанне, Багушэвіч ступіў на віленскі брук, убачыў горад сваёй маладосці. Уладкаваўся на працу ў Віленскі акруговы суд, каб мець магчымасць абараняць інтарэсы простых сялян.*

*Яшчэ жывучы на Украіне, Багушэвіч пачаў пісаць вершы. Пасля выдаў два зборнікі "Дудка беларуская" і "Смык беларускі". У Прадмовах да гэтых зборнікаў ён гаварыў пра мову, "як адзежу душы"*

*"Братцы мілыя, дзеці Зямлі-Маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя мужыцкай завуць, а завецца яна беларускай.*

*За месяц да смерці збалелы гаспадар Кушлян падпісаў фінансавыя рахункі на адкрыццё барэльефа Адаму Міцкевічу ў Вільні. Адкрыццё – патаемнае, скрытае ад чужога вока, -- адбылося ў касцёле Святога Яна світанкам 18 чэрвеня 1899 года.*

*Горка гучыць, аднак у свае 60 гадоў паэт мог сказаць, што "зажыўся на гэтай зямлі". Ягоныя паплечнікі адзін за адным пакідалі свет: ад чорнай воспы, набытай у Петрапаўлаўскай крэпасці, згарэў 24-гадовы Адам Гурыновіч; спакутаваны хваробамі,разбіты паралюшамі, адышоў мінчук Янка Лучына; у слуцкай багадзельні скончыў жыццёвы шлях беларускі паэт Альгерд Абуховіч.*

*28 красавіка 1900 года… у сваім маёнтку адышоў Францішак Багушэвіч*

У Жупранах звоняць званы –
Ашмянкі плынь халадзее.
На чатырох вараных
Вязуць Бурачка Мацея.
Якая высокая сіла
асвечвае сумны абрад--
сармацкі звычай ці сімвал?
Мужыцкі быў адвакат!

*Свой апошні спачын паэт знайшоў на вясковых могілках у Жупранах. На магілу мясцовыя сяляне паклалі вянок з простай яліны, перавіты стужкамі.*

***Грае дудка, на сцэне Багушэвіч і селянін***

Ён сядзеў каля дарогі,
Як туман, увесь сівы.
--Бурачок, ты ж пахаваны.
--Дудка грае – я жывы.
--Падкажы мне, што іграці?
--Грай, што маеш да душы,
Толькі ад няшчырай песні
Дудку, браце, беражы.
І пайшоў ён па дарозе,
Як туман, увесь сівы,
--Бурачок жа пахаваны.
--Дудка грае – ён жывы.

*У гонар Багушэвіча ў Жупранскім касцёле ўстаноўлена памятная дошка з партрэтам паэта, а на Лысай гары ў Кушлянах на камяні, каля якога так любіў бываць паэт і пад які, паводле падання, хаваў свае вершы, быў выбіты надпіс «Памяці Мацея Бурачка. 1900». Заснавальнік музея-сядзібы паэта ў Кушлянах Міхаіл Сымонавіч Ляпеха пасадзіў каля таго валуна 60 дубоў. Сёння гэта ўжо цэлы лес.*

ДАДАТАК 6

## На беразе хуткай Ашмянкі
## (па матэрыялах “Настаўніцкай газеты”)

Ігар Грэчка

“Вось там, на ўзвышшы, каля касцёла…” – ветліва падкажуць кожнаму цікаўнаму чалавеку жыхары вёскі Жупраны, што ў Ашмянскім раёне, месца пахавання Францішка Багушэвіча. Нават могуць расказаць некаторыя звесткі з жыцця пісьменніка, пра якія не ў кожным падручніку і энцыклапедычным даведніку прачытаеш. “А яшчэ ў нашай школе ёсць цудоўны музей”, - з гонарам дададуць вяскоўцы.

Больш за 30 гадоў шматлікія цікавыя і ўнікальныя экспанаты музея Жупранскай сярэдняй школы дапамагаюць больш глыбока спазнаць нялёгкі жыццёвы і творчы шлях Мацея Бурачка не толькі настаўнікам і вучням, але і ўсім, хто неабыякавы да беларускай літаратурнай спадчыны.

…Не наканавала матухна-прырода гэтай рэчцы паважна плысці сярод бяскрайніх палескіх балот альбо ганарова вітацца плёскатам хваль з высокімі шумлівымі соснамі ды ёлкамі прыдзвінскіх лясоў. Але не крыўдуе Ашмянка, весела і бадзёра бяжыць па ўзгорках Гродзеншчыны. І ні на што не прамяняе іх, асабліва калі над бясконцымі засмужанымі даляглядамі з-за гушчэчы яшчэ зімовых, са снегам хмар усё часцей з’яўляецца вясновы блакіт. Ды і не бяда, што вузкая. Захоча – і ў любы час пойдзе гуляць па сваёй пойме, нечаканым госцем завітае на сялянскія падворкі, наробіць столькі бяды, што нават Прыпяць і Заходняя Дзвіна пазайздросцяць. Няхай усе ведаюць, што на гэтай зямлі гаспадыня яна – Ашмянка.

“Паводка!Паводка! Хуткая Ашмянка не пакінула цэлым ніводнага моста, ніводнага млына. Не ў аднаго забрала яна ўвесь набытак і нават жыццё… Бедны народ на ўсім узбярэжжы галосіць з роспачы”, - так у 1888 годзе апісваў свавольствы рэчкі Францішак Багушэвіч.

З багатай рознажанравай творчай спадчыны пісьменніка гэтае апісанне для Галіны Браніславаўны Лукша, кіраўніка школьнага літаратурнага музея Ф. К. Багушэвіча (гэтую пасаду настаўніца беларускай мовы і літаратуры займае з 1984 года), а таксама для вучняў, удзельнікаў экскурсійнай групы, з'яўляецца адным з самых дарагіх. І нядзіўна, бо ў Галіны Браніславаўны з Ашмянкай звязаны самыя цёплыя ўспаміны юнацтва і маладосці. Ну а для вучняў рэчка – добрая сяброўка, асабліва ў дні канікул. Спякотным летнім днём яна падорыць прыемную прахалоду, а зімою ахвотна дазволіць пакоўзацца на слізкім лёдзе. Таму падчас экскурсій у музейнай зале абавязкова гучыць: "Паводка! Паводка! Хуткая Ашмянка…" Але сустракаюць экскурсаводы такімі словамі:

З 15 стагоддзя ў летапіс вякоў
Жупранскае паселішча ўпісалі з тых гадоў.
Князь Вітаўт правіў ім і ваявода Монвід,
І Радзівілаў род гаспадаром быў 300 год,
І назву мела гучную мястэчка,
Жупранскім графствам звалася яно...

- Гэты верш напісала Марына Валер'еўна Афанасенка, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўніца сусветнай мастацкай культуры. Жупраны маюць вельмі багатую і цікавую гісторыю, таму, безумоўна, аповед пра Францішка Багушэвіча мы не можам не пачаць са знаёмства з мінулым Жупран, яго ваколіц, тых мясцін, з якімі цесна звязаны жыццё і творчасць класіка нашай літаратуры, - сказала Галіна Браніславаўна.

Сярод цікавых экспанатаў адпаведнага тэматычнага раздзела на асобым стэндзе змешчана незвычайная вялікая карта былога Ашмянскага павета, малюнак Язэпа Драздовіча з выявай Жупран.

Варта адзначыць, што члены экскурсійнай групы (вучні 10-га класа Яна Бурынская, Аксана Аляхновіч, Уладзіслаў Педчанка, Максім Шымановіч, Юля Дорняк, Насця Лукша, Ірына Піляк, Алёна Паўлюшкевіч, Люда Сухадольская) пад кіраўніцтвам Галіны Браніславаўны актыўна вывучаюць мінулае свайго краю. Зусім нядаўна яны ўдзельнічалі ў раённым конкурсе "Галасы гісторыі",

што праводзіцца раз у два гады, занялі на ім першае месца. Падчас прадстаўлення сваёй каманды вучні выконвалі песню, паказвалі слайды пра родныя мясціны і, канечне, расказвалі пра Францішка Багушэвіча, пра храм, фундатарам будаўніцтва якога быў бацька пісьменніка. І ўсё гэта па ўмовах конкурсу было выканана дзецьмі толькі за 10 хвілін.

Здзіўляе, як можна за такі невялікі час падаць такі багаты і цікавы матырыял? Аказваецца, нічога дзіўнага тут няма: для вучняў Жупранскай школы гэта не ўпершыню.

-Вы яшчэ не бачылі, як нашы дзеці літаральна за 10-15 хвілін праводзяць экскурсію па музеі. Прычым расказваюць пра жыццё Францішка Багушэвіча падрабязна, захапляльна, - адзначыла настаўніца.

Уся справа ў тым, што некалькі гадоў назад Галіна Браніславаўна распрацавала своеасаблівую тэатралізаваную форму правядзення экскурсіі. З кожным раздзелам экспазіцыі знаёміць адзін вучань, член экскурсійнай групы, які апавядае толькі пра пэўны перыяд жыццёвага шляху пісьменніка. Наступны вучань расказвае пра чарговы перыяд у храналагічнай паслядоўнасці… Такім чынам атрымліваецца своеасаблівы ланцужок бесперапыннага аповеду, які вядуць каля 10 навучэнцаў.

Такую форму экскурсіі, па словах Галіны Браніславаўны, асабліва зручна выкарыстоўваць, напрыклад, падчас правядзення школьных семінараў. І хоць час такіх мерапрыемстваў распісаны літаральна па хвілінах, настаўнікам, безумоўна, хочацца  наведаць жупранскі музей, выкарыстаць цудоўную магчымасць не проста паглядзець багатую і прыгожа афармленую экспазіцыю, але і пачуць цікавыя і малавядомыя звесткі з жыцця пісьменніка. Вось тут якраз і дарэчы тэатралізаваная экскурсія. Да таго ж  слухаць аповеды не двух-трох экскурсаводаў, а , напрыклад, дзесяці больш цікава і менш утомна. Перавага музея Жупранскай сярэдняй школы ў тым, што яго экспазіцыя размешчана ў адным вялікі пакоі, аповед не перапыняецца ні на хвіліну, што таксама значна памяншае час экскурсіі.

-А яшчэ ў нас прадугледжана музычнае суправаджэнне. У той час, калі расказваецца аб тым, як пісьменнік пакінуў родны край, паехаў на Украіну, як ён у думках, нібыта тая птушка з выраю, ірваўся на Беларусь, у выкананні вучаніцы Юлі Дорняк гучыць паланез М. Агінскага “Развітанне з Радзімай”, - сказала настаўніца.

Праз некалькі імгненняў чароўныя гукі акардэона напоўнілі музейны пакой. А Уладзіслаў Педчанка пачаў расказваць пра тое, як пасля падаўлення паўстання 1863 года Ф.Багушэвіч паехаў на Украіну, вучыўся ў Нежынскім юрыдычным ліцэі, працаваў судовым следчым у розных паветах Чарнігаўскай губерні; потым, амаль праз 20 гадоў, перабраўся у Вільню і толькі з-за цяжкой хваробы перад самай смерцю вярнуўся ў родныя мясціны, у Кушляны.

Па словах кіраўніка музея, калегі-настаўнікі заўсёды пакідаюць музей задаволеныя і часта шкадуюць, што час знаёмства з цікавай экспазіцыяй абмежаваны.

-Безумоўна, трэба сказаць вялікі дзякуй вядомаму беларускаму краязнаўцу, даследчыку жыццёвага і творчага шляху Францішка Багушэвіча Уладзіміру Содалю, які ў 1990 годзе разам з майстрамі стварыў новую экспазіцыю да 150-й гадавіны з дня нараджэння пісьменніка,- сказала Галіна Браніславаўна.

Вялікую дапамогу ў афармленні экспазіцыі аказаў настаўнік працоўнага навучання і выяўленчага мастацтва Жупранскай школы Уладзімір Францавіч Шымановіч (аўтар некалькіх карцін), а таксама народны майстар з Ашмян Пётр Бусловіч, які зрабіў драўляны бюст пісьменніка, што знаходзіцца пасярэдзіне музейнай залы.

А вось ініцыятарам стварэнне музея з’яўляецца былы дырэктар Жупранскай школы Міхаіл Іосіфавіч Крайноў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Хоць педагог ужо даўно на заслужаным адпачынку, але і цяпер часта наведвае школьны музей, дае слушныя парады па афармленні экспазіцыі. Разам з настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Канстанцінам Аляксеевічам Кадыркам, які, на жаль, ужо памёр, у далёкія 1960-я гады яны пачалі збіраць

экспанаты, далучылі да гэтай справы і вучняў. Адкрыццё музея адбылося 22 сакавіка 1970 года і было прымеркавана да 130-годдзя з дня нараджэння Ф.Багушэвіча.

За гады работы музея сабрана вялікая колькасць цікавых і унікальных экспанатаў. Так, зусім нядаўна экспазіцыю папоўніла ксеракопія матрыкулы ( атэстата Віленскай губернскай гімназіі аб здольнасцях Ф.Багушэвіча да паступлення ў Пецярбургскі універсітэт).

-А вось яшчэ цікавы дакумент – адзнакі за экзамен студэнтаў юрыдычнага ліцэя ў Нежыне. Не так даўно паявіўся ў нас здымак Габрыэлі, жонкі пісьменніка, і партрэт іх дачкі Канстанцыі. Як бачыце, яна вельмі падобная да маці. Дарэчы, у дзяўчыны быў вельмі прыгожы голас, ёй нават прарочылі кар'еру опернай спявачкі. Але ў 15 гадоў Канстанцыя захварэла на шкарлятыну і некаторы час размаўляла толькі шэптам, прыгажосць голасу была страчана назаўсёды, - паведамілі вучні.

Усяго ў музеі налічваецца каля 200 экспанатаў. Самымі каштоўнымі з іх, на думку Галіны Браніславаўны, з'яўляюцца фотаздымкі, асабліва сям'і Багушэвічаў, ксеракопіі матрыкулы, нумароў "Нашай нівы" з творамі пісьменніка (сярод іх апавяданне "Сведка"); кнігі, выдадзеныя ў 1920-я гады (напрыклад, зборнік "Дудка беларуская" быў знойдзены ў куфэрку аднаго селяніна ў вёсцы Кісялева); здымкі старой дарогі, якая калісьці звязвала станцыю Ашмяны і Кушляны і па якой неаднойчы ездзіў пісьменнік.

Ксеракопіі шматлікіх дакументаў, рукапісаў, дзесяткі кніг і, безумоўна, здымкі… На жаль, цікавая экскурсія хутка скончылася. Але Галіна Браніславаўна запрасіла ў суседні пакойчык.

-Некалькі гадоў назад дырэктар школы Соф'я Іосіфаўна Кавалёнак прапанавала стварыць тут этнаграфічны куток у выглядзе традыцыйнай хаты селяніна, чые правы, як вядома, абараняў "мужыцкі адвакат", - расказала Галіна Браніславаўна.

Кіраўнік музея, настаўнікі школы, а таксам вучні ахвотна адгукнуліся на такую прапанову. Усе добра разумелі, што праз пэўны час у вёсцы ўжо не знойдзеш ні

калаўрота, ні прасніцы,  ні ступы. А каб справа рухалася больш спорна, Галіна Браніславаўна сваімі актыўнымі дзеяннямі паказвала добры прыклад і калегам, і вучням. Пры афармленні хаты быў выкарыстаны нарыс Уладзіміра Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”, дзе ёсць апісанне традыцыйнага інтэр’ера сялянскай хаты гэтага этнаграфічнага рэгіёна.

- Многія экспанаты, якія тут знаходзяцца, належалі яшчэ маёй бабулі Алене Антонаўне Нікадон, 1909 года нараджэння,- гэта і калаўрот, і прасніца, і лапата для хлеба, і начовачкі, і дзіцячая калыска, і  посцілка, і ходнікі, - паведаміла Галіна Браніславаўна.

Шмат экспанатаў прынеслі вучні і настаўнікі, напрыклад, кросны - вучаніца Людміла Пяткевіч, падсвечнікі - Наталля Масальская. Стары стол дала дырэктар школы Соф’я Іосіфаўна, ступу - Фёдар Васільевіч Пількоўскі, былы настаўнік гісторыі. Незвычайную ж печку зрабіў У.Ф.Шымановіч. А Марыя Альбінаўна Лукша, настаўніца пачатковых класаў, прынесла з вёскі Клеі вялікі гаршчок… з дзіркай. Аказваецца, што ў вайну ў гэты гаршчок трапіў асколак ад снарада, пэўны час барабаніў аб гліняныя сценкі, прабіў дзірку і вылецеў, нікога не параніўшы.

… Бяжыць-віецца па шматлікіх узгорках хуткая свавольніца Ашмянка. Кудысьці спяшаецца, гарэза. У нізіне каля жупранскіх сядзіб хуценька цячэ да Ашмянкі, сваёй матулі ручаек. “ Дык побач, вось там, на ўзвышшы, каля касцёла…” – ветліва падкажуць кожнаму цікаўнаму чалавеку вяскоўцы месца пахавання Францішка Багушэвіча.

Дадатак 7

**Гісторыя Багушэвічавай "Дудкі"**

Перагортваючы старонкі зборніка, мы акунаемся ў эпоху рэалізму. "Марудна, вельмі марудна пішуцца песні…" – скардзіўся Ф. Багушэвіч свайму сябру Я. Карловічу. І для такіх скаргаў былі сур'ёзныя падставы. Багушэвіч не мог цалкам аддавацца любімай справе – літаратурнай дзейнасці. Час адбіралі праца ў судзе, клопаты аб сям'і. Пісанне беларускіх вершаў не толькі не прыносіла якіх-небудзь матэрыяльных выгод, а, наадварот, патрабавала грашовых затрат і вялікіх турбот на іх выданне

Друкаваць свае творы на радзіме Багушэвіч не мог. Царызм праследаваў беларускую дэмакратычную літаратуру, і таму першая кніга выйшла за межамі Беларусі. У 1891 годзе ў Кракаве пад псеўданімам Мацей Бурачок паэт надрукаваў зборнік «Дудка беларуская».

"Дудка беларуская " – гэта мастацка-публіцыстычны маніфест, што Беларусь жыла, жыве, і надыдзе такая гадзіна, калі перастанем мы плакаць над сваёй доляй. Якраз з выхаду "Дудкі беларускай" мы адлічваем эпоху свайго нацыянальнага і культурнага адраджэння.

Зборнік выйшаў у канцы жніўня пачатку верасня. Адкуль мы пра гэта ведаем? З ліста Ф. Багушэвіча за 4 верасня таго ж года, у якім ён паведамляе, што карэктуру, з процьмай памылак, вычытаў. "Дудка беларуская" зарэгістравана ў бібліяграфічным даведніку "Przewodnik Bibliograficzny" (1891г. №9 с.127).

Напісана і набрана кніжка лацінкаю. Гэта адпавядала традыцыі беларускага пісьма XIXстагоддзя і грамадскаму становішчу беларусаў, якія, асабліва ў заходнім абшары краю, калі і мелі якую адукацыю, то найперш праз лацінскі шрыфт.

"Дудка беларуская" 1891 года мела тыраж тры тысячы экземпляраў. З іх на сёння ацалела толькі дзве кніжачкі. Адна – у Цэнтральнай бібліятэцы Акадэміі навук Літвы, другая – у навуковай бібліятэцы Вільнюсскага ўніверсітэта імя Вацлава Капсукаса. Віленскія экземпляры маюць тонкую папяровую светла-

чырвонага колеру вокладку, крыху пабурэлую. Папера даволі добрая. Кошт 50 цэнтаў. Дапамог выдаць кніжку Ян Карловіч. Натхняла на гэту працу Эліза Ажэшка.

“Дудка беларуская” была надрукавана ў друкарні Уладзіслава Анчыца. Адтуль яна патаемнымі сцежкамі трапіла на радзіму. Прадавалі яе таксама патаемна ў віленскай краме Багушэвічавага прыяцеля Зыгмунта Нагродскага, які гандляваў плугамі, сячкарнямі, баронамі. Выданне было бесцэнзурнае, забароненае, а значыць па-за законам. За чытанне гэтай кнігі пагражалі арышт, астрог. Такое ж пакаранне чакла і аўтара “Дудкі”. Ён гэта прадбачыў і мусіў выдаць кніжку пад псеўданімам Мацей Бурачок.

Дарэчы, у чым сэнс псеўданімаў Францішка Багушэвіча “Сымон Рэўка з-пад Барысава” ды “Мацей Бурачок”? Звернемся да тлумачэння, якое дае даследчык творчасці Ф. Багушэвіча Уладзімір Содаль:

- Францішак Багушэвіч родам з-пад Вільні, але гэтае ўдакладненне, “з-пад Вільні”, ужо заняў Кастусь Каліноўскі: “Яська-гаспадар з-пад Вільні”. І Багушэвіч бярэ “Сымон Рэўка з-пад Барысава”. Чаму з-пад Барысава? Ды таму што пад Барысавам, на Лагойшчыне, жыў выдатны чалавек – граф Тышкевіч, які заснаваў у Вільні музей старажытнасці, у стварэнні якога браў удзел і Багушэвіч. А чаму Бурачок? Бо буракі абнаўляюць кроў, а Багушэвіч абнаўляў кроў нацыі… А Мацей – святы.

Тым не менш кніжка шырока разышлася сярод сялянаў і не толькі сярод іх. Кніжкай зацікавіўся і шмат хто з інтэлігенцыі. Вядома, што “Дудку” ў сваіх бібліятэках мелі Адам Гурыновіч, Эліза Ажэшка, Яўхім Карскі, Напалеон Роўба, Адам Багдановіч, Ян Карловічі іншыя. Але кніжак усім не хапала. Пісьменныя перапісвалі Багушэвічавы творы ад рукі ў свае сшытачкі, непісьменныя завучвалі іх на памяць.

“Дудка беларуская” хутка разышлася, і ў 1896 годзе яе перавыдалі ў тым жа Кракаве на сродкі прыяцеля Багушэвіча Зыгмунта Нагродскага. З гэтага выдання ацалела 4 экземпляры. Два захоўваюцца ў Віленскіх біблятэках, адзін

у Маскве ў Дзяржаўнай бібліятэцы і адзін у Гудзевіцкім музеі (на Гродзеншчыне).

Праз 11 гадоў у 1907 годзе “Дудку беларускую” перавыдала ў Пецярбургу выдавецкая суполка “Загляне сонца і ў наша ваконца”. Незадоўга да пачатку 1-й сусветнай вайны беларускія асветнікі паспелі выпусціць у свет зноў у Пецярбургу 4-е выданне Багушэвічавай кніжкі.

Да 1918 года “Дудка баларуская” мела пяць выданняў. (Такога поспеху не меў дагэтуль ніводзін беларускі твор). Усе кнігі былі надрукаваны лацінкаю.

Кірыліцай “Дудка беларуская” з’явілася толькі ў 1922 годзе і адразу ў трох гарадах – Вільні, Коўне, Мінску. Віленскую і ковенскую кніжкі “Дудкі беларускай” кірыліцай мае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. А вось мінскага выдання на Беларусі няма.

Нашаму школьнаму музею пашанцавала мець віленскае выданне зборніка “Дудка беларуская” кірыліцай 1922 года выдання і шостае выданне кніжкі “Дудка беларуская” лацінкай 1927 года, ахвяраваныя музею вядомым крытыкам Віктарам Каваленкам.

## Гартаючы “Дудку беларускую”…

Беручы ў рукі Багушэвічаву “Дудку”, гартаем яе і акунаемся ў тую эпоху, калі пісаліся гэтыя творы. Зборнік пачынаецца “Прадмовай”.

У "Прадмове” да зборніка "Дудка беларуская” Багушэвіч ставіў мэту — будзіць павагу да сваей мовы, літаратуры, культуры, будзіць нацыянальную свядомасць народа. ”Прадмова” — глыбока патрыятычны твор. У ёй паэт выступае як патрыет Радзімы. Ф.Багушэвіч выступаў у беларускай. літаратуры як заснавальнік крытычнага рэалізму. (Рэалізм — творчы метад, які патрабуе перш за ўсе праўдзівага паказу жыцця, адлюстравання яго такім, якое яно есць). Рэалізм Багушэвіча мае крытычны характар. Аб гэтым сведчаць яго творы, у якіх ідзе размова пра народнае жыцце, пра беларускага селяніна і яго прыгнятальнікаў. Багушэвіч надаваў літаратуры вялікае выхаваўча-

пераўтваральнае значэнне. Паэзія Багушэвіча давала праўдзівае ўяўленне аб жыцці, абуджала пратэст, рэвалюцыянізавала яго настроі і думкі.

Неўміручыя радкі "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!" сёння вядомы кожнаму, хто не адмовіўся ад вывучэння беларускай мовы.

## "Прадаць "Дудку"? – О, не!

Францішка Багушэвіча ў Жупранах ведалі ўсе, не толькі дарослыя, але і дзеці.Багушэвічаў знаёмы Вільгельм Невядомскі згадваў: "Калі ні прыедзе ў Жупраны Багушэвіч, заўсёды яго абступаюць людзі, з імі паэт гутарыў на беларускай мове. Сяляне яго вельмі любілі і паважалі, бо быў не ганарлівы, даступны чалавек"…

Жупранцы ведалі і любілі Багушэвічавы творы. Пісьменныя перапісвалі іх сабе ў сшытачкі, а непісьменныя завучвалі на памяць. Усё напісанае Багушэвічам было блізкае жупранцам.

Вядомы гісторык Мікола Ермаловіч згадвае: "У пачатку 1950-х гадоў у Жупранах ладзіўся вечар, прысвечаны Ф. Багушэвічу. На гэтай вечарыне са словам выступаў адзін тутэйшы брыгадзір. Была ў яго "Дудка беларуская 1891 года выдання. Колькі я ў яго ні прасіў, колькі ні маліў, - успамінае Ермаловіч, - прадайце ці так дайце, ахвяруйце – для музея! Усе глядзець будуць!" – чуў: "Прадаць "Дудку"? Прадаць Багушэвіча? О, не!.. Багушэвіч не прадаецца! Ні за якія грошы… Пакуль жыву, пакуль дыхаю, хай будзе са мной, пры мне. Без яго мне будзе маркотна… Без яго мне будзе нечага не хапаць"…

## "Дудцы беларускай" – 120

У 2011 годзе споўнілася 120 гадоў з дня выхаду зборніка "Дудка беларуская". У 1990 годзе да 150-годдзя Багушэвіча з'явілася факсімільнае выданне "Дудкі беларускай" 1891 года, падрыхтаванае "Мастацкай літаратурай" ***Факсімільe лацінскае слова, якое азначае перапісаны з чыйго-небудзь пісьма***. Значыць гэты зборнік выдалі такім, як ён выглядаў у выданні 1891 года.

Дадатак 8

## Музейныя занятакі

**Тэма** Гісторыя аднаго экспаната

**Мэты:** пазнаёміць наведвальнікаў з гісторыяй выхаду ў свет зборніка Ф. Багушэвіча “Дудка беларуская. Зацікавіць творчасцю паэта-дэмакрата. Выхоўваць культуру паводзін у музеі

**Экскурсовод**. Мы знаходзімся ў літаратурным музеі Ф.К. Багушэвіча. Перш чым пачаць нашы музейныя заняткі, неабходна ўспомніць правілы паводзін у музеі.

**Экскурсавод**. Якія правілы вы ведаеце?

***Дзеці:***

*У музеі нельга гучна размаўляць, каб не перашкаджаць іншым наведвальнікам.*

*У музеі трэба ўважліва слухаць экскурсавода, тады даведаешся шмат цікавага*

*Нельга чапаць музейныя экспанаты рукамі*

**Экскурсавод**. Як вы думаеце, чаму?

***Дзеці***. *Экспанаты старыя, яны могуць рассыпацца, спэцкацца ад нашых рук.*

**Экскурсавод.** Усё, што вы сказалі, правільна. Цяпер можна пачынаць знаёмства з тэмай нашых заняткаў.

**Экскурсавод** Сённяшнія нашы заняткі працягваюць цыкл заняткаў “Гісторыя аднаго аднаго экспаната”

**Экскурсавод** Сябры мае, мы ўжо некалькі разоў ужылі слова ***экспанат***. Што абазначае гэта слова?

*Дзеці спрабуюць тлумачыць*

***Экспанат – (ад лац. Exspontus – выстаўлены напаказ) прадмет, выстаўлены для агляду ў музеі ці на выставе.***

Экспанаты выклікаюць вялікую цікавасць, захоўваюць у сабе нешта таемнае.

**Экскурсавод.** Зараз я прапаную вам невялікую інсцэніроўку, паглядзеўшы якую, вы павінны здагадацца, пра які экспанат я вам сёння раскажу.

***Інсцэніроўка***

*На камені сядзіць Ф. Багушэвіч, у руках трымае свой зборнік "Дудка беларуская". Гучыць музыка дудкі.*

Ён сядзеў каля дарогі,
Як туман, увесь сівы.
--Бурачок, ты ж пахаваны.
--Дудка грае – я жывы.
-- Падкажы мне, што іграці?
-- Грай, што маеш на душы,
Толькі ад няшчырай песні
Дудку, браце, беражы.
І пайшоў ён па дарозе,
Як туман, увесь сівы.
--Бурачок жа пахваны.
-- Дудка грае – ён жывы!

*Юнак, які выконваў ролю Багушэвіча, падыходзіць да пастамента і ставіць на яго Багушэвічаў зборнік. Экскурсавод адгортвае 1-ю старонку*

Пра што мы будзем сёння гаварыць?

Правільна, пра зборнік Ф. Багушэвіча "Дудка беларуская"

Давайце зараз вернемся ў 19 стагоддзе і паслухаем пра гісторыю напісання зборніка "Дудка беларуская".

**І блок**

**Гісторыя Багушэвічавай "Дудкі"**

**Э 1** Перагортваючы старонкі зборніка, мы акунаемся ў эпоху рэалізму. "Марудна, вельмі марудна пішуцца песні…" – скардзіўся Ф. Багушэвіч свайму сябру Я. Карловічу. І для такіх скаргаў былі сур'ёзныя падставы. Багушэвіч не мог цалкам аддавацца любімай справе – літаратурнай дзейнасці. Час адбіралі праца ў судзе, клопаты аб сям'і. Пісанне беларускіх вершаў не толькі не

прыносіла якіх-небудзь матэрыяльных выгод, а, наадварот, патрабавала грашовых затрат і вялікіх турбот на іх выданне

**Э 2** Друкаваць свае творы на радзіме Багушэвіч не мог. Царызм прасследаваў беларускую дэмакратычную літаратуру, і таму першая кніга выйшла за межамі Беларусі. У 1891 годзе ў Кракаве пад псеўданімам Мацей Бурачок паэт надрукаваў зборнік «Дудка беларуская».

**Э 1** “Дудка беларуская ” – гэта мастацка-публіцыстычны маніфест, што Беларусь жыла, жыве, і надыдзе такая гадзіна, калі перастанем мы плакаць над сваёй доляй. Якраз з выхаду “Дудкі беларускай” мы адлічваем эпоху свайго нацыянальнага і культурнага адраджэння.

**Э 2** Зборнік выйшаў у канцы жніўня пачатку верасня. Адкуль мы пра гэта ведаем? З ліста Ф. Багушэвіча за 4 верасня таго ж года, у якім ён паведамляе, што карэктуру, з процьмай памылак, вычытаў. “Дудка беларуская” зарэгістравана ў бібліяграфічным даведніку ”Przewodnik Bibliograficzny” (1891г. №9 с.127).

**Э 1** Напісана і набрана кніжка лацінкаю. Гэта адпавядала традыцыі беларускага пісьма XIXстагоддзя і грамадскаму становішчу беларусаў, якія, асабліва ў заходнім абшары краю, калі і мелі якую адукацыю, то найперш праз лацінскі шрыфт.

**Э 2** “Дудка беларуская” 1891 года мела тыраж тры тысячы экземпляраў. З іх на сёння ацалела толькі дзве кніжачкі. Адна – у Цэнтральнай бібліятэцы Акадэміі навук Літвы, другая – у навуковай бібліятэцы Вільнюсскага ўніверсітэта імя Вацлава Капсукаса. Віленскія экземпляры маюць тонкую папяровую светла-чырвонага колеру вокладку, крыху пабурэлую. Папера даволі добрая. Кошт 50 цэнтаў. Дапамог выдаць кніжку Ян Карловіч. Натхняла на гэту працу Эліза Ажэшка.

**Э 1** “Дудка беларуская” была надрукавана ў друкарні Уладзіслава Анчыца. Адтуль яна патаемнымі сцежкамі трапіла на радзіму. Прадавалі яе таксама патаемна ў віленскай краме Багушэвічавага прыяцеля Зыгмунта Нагродскага, які гандляваў плугамі, сячкарнямі, баронамі. Выданне было бесцэнзурнае,

забароненае, а значыць па-за законам. За чытанне гэтай кнігі пагражалі арышт, астрог. Такое ж пакаранне чакла і аўтара "Дудкі". Ён гэта прадбачыў і мусіў выдаць кніжку пад псеўданімам Мацей Бурачок.

**Э 2** Дарэчы, у чым сэнс псеўданімаў Францішка Багушэвіча "Сымон Рэўка з-пад Барысава" ды "Мацей Бурачок"? Звернемся да тлумачэння, якое дае даследчык творчасці Ф. Багушэвіча Уладзімір Содаль:

- Францішак Багушэвіч родам з-пад Вільні, але гэтае ўдакладненне, "з-пад Вільні", ужо заняў Кастусь Каліноўскі: "Яська-гаспадар з-пад Вільні". І Багушэвіч бярэ "Сымон Рэўка з-пад Барысава". Чаму з-пад Барысава? Ды таму што пад Барысавам, на Лагойшчыне, жыў выдатны чалавек – граф Тышкевіч, які заснаваў у Вільні музей старажытнасці, у стварэнні якога браў удзел і Багушэвіч. А чаму Бурачок? Бо буракі абнаўляюць кроў, а Багушэвіч абнаўляў кроў нацыі… А Мацей – святы.

**Э 1** Тым не менш кніжка шырока разышлася сярод сялянаў і не толькі сярод іх. Кніжкай зацікавіўся і шмат хто з інтэлігенцыі. Вядома, што "Дудку" ў сваіх бібліятэках мелі Адам Гурыновіч, Эліза Ажэшка, Яўхім Карскі, Напалеон Роўба, Адам Баргановіч, Ян Карловічі іншыя. Але кніжак усім не хапала. Пісьменныя перапісвалі Багушэвічавы творы ад рукі ў свае сшытачкі, непісьменныя завучвалі іх на памяць.

**Э 2** "Дудка беларуская" хутка разышлася, і ў 1896 годзе яе перавыдалі ў тым жа Кракаве на сродкі прыяцеля Багушэвіча Зыгмунта Нагродскага. З гэтага выдання ацалела 4 экземпляры. Два захоўваюцца ў Віленскіх біблятэках, адзін у Маскве ў Дзяржаўнай бібліятэцы і адзін у Гудзевіцкім музеі (на Гродзеншчыне).

**Э 1** Праз 11 гадоў у 1907 годзе "Дудку беларускую" перавыдала ў Пецярбургу выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша ваконца". Незадоўга да пачатку 1-й сусветнай вайны беларускія асветнікі паспелі выпусціць у свет зноў у Пецярбургу 4-е выданне Багушэвічавай кніжкі.

**Э 2** Да 1918 года "Дудка баларуская" мела пяць выданняў. (Такога поспеху не меў дагэтуль ніводзін беларускі твор). Усе кнігі былі надрукаваны лацінкаю.

**Э 1** Кірыліцай “Дудка беларуская” з’явілася толькі ў 1922 годзе і адразу ў трох гарадах – Вільні, Коўне, Мінску. Віленскую і ковенскую кніжкі “Дудкі беларускай” кірыліцай мае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. А вось мінскага выдання на Беларусі няма.

**Э 2** Нашаму школьнаму музею пашанцавала мець віленскае выданне зборніка “Дудка беларуская” кірыліцай 1922 года выдання і шостае выданне кніжкі “Дудка беларуская” лацінкай 1927 года, ахвяраваныя музею вядомым крытыкам Віктарам Каваленкам.

**II блок**

**Гартаючы “Дудку беларускую”…**

**Э 1** Беручы ў рукі Багушэвічаву “Дудку”, гартаем яе і акунаемся ў тую эпоху, калі пісаліся гэтыя творы. Зборнік пачынаецца “Прадмовай”.

У "Прадмове” да зборніка "Дудка беларуская” Багушэвіч ставіў мэту — будзіць павагу да сваей мовы, літаратуры, культуры, будзіць нацыянальную свядомасць народа. ”Прадмова” — глыбока патрыятычны твор. У ёй паэт выступае як патрыет Радзімы. Ф.Багушэвіч выступаў у беларускай. літаратуры як заснавальнік крытычнага рэалізму. (Рэалізм — творчы метад, які патрабуе перш за ўсе праўдзівага паказу жыцця, адлюстравання яго такім, якое яно есць). Рэалізм Багушэвіча мае крытычны характар. Аб гэтым сведчаць яго творы, у якіх ідзе размова пра народнае жыцце, пра беларускага селяніна і яго прыгнятальнікаў. Багушэвіч надаваў літаратуры вялікае выхаваўча-пераўтваральнае значэнне. Паэзія Багушэвіча давала праўдзівае ўяўленне аб жыцці, абуджала пратэст, рэвалюцыянізавала яго настроі і думкі.

Неўміручыя радкі “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!” сёння вядомы кожнаму, хто не адмовіўся ад вывучэння беларускай мовы.

**Чытальнік 1**

Вучыў нас:
і верце, і дбайце…
І словы ішлі па зямлі

Бацькоўскія:

“Не пакідайце”…

Не кінулі мы, не маглі…

Пакутна нямелі

У горле маўчальніцтва халады

Мацей Бурачок:

“Не ўмёрлі”

А значыць жывеш і ты.

**Э 2** Зборнік «Дудка беларуская” адкрываецца вершам “Мая дудка”. У ім творчасць паэта параўноўваецца з ігрой на дудцы.

*На фоне музыкі дудкі чытаецца ўрывак з верша “Мая дудка”*

**Чытальнік 2**

МАЯ ДУДКА

Эх, скручу я дудку

Такое зайграю,

Што ўсім будзе чутка

Ад краю да краю!

Ой! то будзе гранне,

Як на павітанне

І як на васэле,

Нядоўга тыкеле:

Прэндка скончу песні...

Покі дудка трэсне,

Ці паглохнуць людзі,

Ці высахнуць грудзі,

Сілы надарвуцца

На радаснай дудцы,

І выцекуць слёзы

На сухія лозы...

**Э 1** Герой верша хоча зрабіць такую дудку, якая б весяліла людзей, выклікала радасць. Але такая дудка маўчыць, бо бачыць вакол сябе слёзы, стогны, плач людзей.

**Э 2** Большасць твораў Багушэвіча прысвечана жыццю беларускага сялянства. Селянін, працавіты і руплівы земляроб, жыве ў галечы. З яго здзекуюцца, называюць цёмным і дурным. А тая раскоша, у якой жывуць паны зароблена рукамі вось гэтага цёмнага селяніна.

*Юнак у сялянскім адзенні чытае ўрывак з верша "Бог не роўна дзеле"*

Чым то дзеіцца на свеце,
Што не роўна дзеле Бог?
Адзін ходзе у саеце,
У золаце з плеч да ног,
А другому, каб прыкрыцца
Хоць анучай — велькі труд;
Весь, як рэшата, свіціцца,
Адны латы, адзін бруд!
Адзін мае хатаў многа,
А вялікіх — касцёл моў;
Увясці б туды хоць Бога,
І той бы з іх не пайшоў.
У другога ў сцяне дзюры,
Вецер ходзе, дым і снег;
Тут карова, свінні, куры...
Тут пакута, тут і грэх!

**Э 1** Багушэвіч, абараняючы мужыка, паказвае, як у яго паступова прачынаецца пачуццё ўласнай годнасці, расце пратэст супраць несправядлівасціАдным з самых яркіх твораў, у якім раскрываецца ўсведамленне селянінам сваей чалавечай. годнасці, з'яўляецца верш "Не

цурайся". У ім ён дае волю мужыку самому выказвацца пра ўсё тое, што набалела ў яго душы. Верш напісан у форме звароту селяніна да інтэлігента-паніча, які цураецца народа, не цікавіцца яго жыццем. У голасе героя чуецца скарга на нядолю, просьба дапамагчы ў бядзе, гнеўная абвінавачванне паноў, высокае ўсведамленне чалавечага гонару. Селянін не проста скардзіцца, ён выказвае патрабаванне лепшага жыцця, патрабуе асветы.

*У зале з'яўляюцца мужык і пан. Інсцэніруецца ўрывак з верша "Не цурайся"*

Не цурайся мяне, панічок,
Што далонь пакрываюць мазолі;
Мазоль — працавітых значок,
Не заразе цябе ён ніколі.
То медаль за труды і за муку,
Не хвароба якая з заразы.
Не стыдайся падаць ты мне руку,
Бо на гэтай руцэ няма сказы!
Эй! смялей адкрывай галаву
На паклон мой табе да зямлі;
Я тваёй галавы не сарву,
І маёй вы б, паны, не ўзялі.
Не ўцякай ад маёй ты сярмягі,—
Мне не стыдна у ёй ані чуць,
Вот твой храк я не меў бы адвагі,
Чортаў храк на сябе апрануць.
На кашулю глядзіш крывым вокам,
Што у хаце мне бабы пашылі,
Прапацела яна маім сокам,
Цэлы тыдзень яе не памылі...
А твая ж? як той снег, як папер,
І пацеў хто, і ткаў, і бяліў,
І хто шыў, і хто праў... а цяпер

Ты той пот на сябе узваліў.
І кашулі той мне было б стыдна,
Што не сам на яе гараваў,
Хоць бялейша яна — не завідна,
Не вазьму, каб ты мне дараваў!
А кінь вокам на хату маю:
І цячэ, і гніе, і крывая,
Усярэдзіне гной і стаіць на гнаю,
І дзіўлюся я сам, як трывае?
Не дзівіся, панок, як жыву,—
Мне ніхто не памог будаваць.
Хоць лянівым у свеце слыву,
А магу свет карміць-гадаваць.
Ты ж пазнаў, што ў ксёнжках стаіць,
А там розуму шмат ад вякоў,
І ўсё можаш па ксёнжках рабіць;
А гдзе ж ксёнжка для нас, мужыкоў?
Гдзе ж нам розуму толькі набраць? —
Знаем толькі загон ды саху
І жывём, каб касіць ды араць,
Ды жывём мы ў Божым страху.
Каб умеў кіраваць я пяром,—
Я бы ксёнжку счыркаў, як папар,
І аб тым, як мы сеем, аром,
І як косім, і жнём Божы дар.
Можа б, ты прачытаў той грызмол
І да працы набраў бы ахвоты,
Шанаваў бы мужыцкі мазол,
Не цураўся б мужыцкай бядоты,
І падаў бы руку мне, сляпому,

І давёў бы мяне да дарогі:
Не блудзіў бы і я серад лому
І калючак, што раняць мне ногі!

**Э 2** Селяніну не сорамна за свой уласны выгляд, мазалі, дрэнную хату, бо ён – стваральнік усіх матэрыяльных каштоўнасцей на зямлі. І таму ён смела патрабуе лепшага жыцця, асветы, праўдзівых кніг пра сялянскае жыццё, чытаючы якія і пан стаў бы шанаваць мужыцкі мазоль, перастаў бы цурацца бядноты.

Герой верша "Ахвяра" звяртаецца з просьбай да бабулі памаліцца за яго, каб ён ніколі не быў панам, бо з панствам у яго асацыіруецца ўсё самае адмоўнае ў жыцці: амаральнасць, разбэшчанасць, сквапнасць, фанабэрыстасць, непавага да слабейшых.

*Інсцэніроўка верша "Ахвяра" (У залу ўваходзяць бабулька і вучань ва ўбранні тагачаснай шляхты)*

Маліся ж, бабулька, да Бога,
Каб я панам ніколі не быў:
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела як трэба рабіў.
Каб прад меншым я носу не драў,
А прад большым не корчыў спіны,
Каб грэх свой прад сабой я пазнаў,
У другіх каб не відзеў віны;
Чужых жон каб не вёў да граху,
А сваю каб як трэба любіў,
Каб мне дзеці былі у слуху,
Каб я бацькам для іх век дажыў.
Каб людзей прызнаваў за братоў,
А багацтва сваё меў за іх,
Каб за край быў умёрці гатоў,
Каб не прагнуў айчызны чужых.

Каб я Бога сваго не акпіў,
Каб не здрадзіў за грошы свой люд,
Каб сваго я дабра не прапіў
І нізашто не меў чужы труд.
Каб па двойчы мне грошы не браць
За праданы кусочак раллі,
Каб сваю мне зямельку араць
І умёрці на ёй хоць калі.
Дык прасі ж ты у Бога, малі,
Каб я панам ніколі не быў!

**Э 2** Багушэвіч свядома выбраў шлях цяжкіх выпрабаванняў і барацьбы, бо найважнейшым для сябе лічыў справядлівасць і праўду.

**III блок "Прадаць "Дудку"? О, не!**

**Э 1** Францішка Багушэвіча ў Жупранах ведалі ўсе, не толькі дарослыя, але і дзеці.Багушэвічаў знаёмы Вільгельм Невядомскі згадваў: "Калі ні прыедз ў Жупраны Багушэвіч, заўсёды яго абступаюць людзі, з імі паэт гутарыў на беларускай мове. Сяляне яго вельмі любілі і паважалі, бо быў не ганарлівы, даступны чалавек"…

Жупранцы ведалі і любілі Багушэвічавы творы. Пісьменныя перапісвалі іх сабе ў сшытачкі, а непісьменныя завучвалі на памяць. Усё напісанае Багушэвічам было блізкае жупранцам.

**Э 2** Вядомы гісторык Мікола Ермаловіч згадвае: "У пачатку 1950-х гадоў у Жупранах ладзіўся вечар, прысвечаны Ф. Багушэвічу. На гэтай вечарыне са словам выступаў адзін тутэйшы брыгадзір. Была ў яго "Дудка беларуская 1891 года выдання. Колькі я ў яго ні прасіў, колькі ні маліў, - успамінае Ермаловіч, - прадайце ці так дайце, ахвяруйце – для музея! Усе глядзець будуць!" – чуў: "Прадаць "Дудку"? Прадаць Багушэвіча? О, не!.. Багушэвіч не прадаецца! Ні за якія грошы… Пакуль жыву, пакуль дыхаю, хай

будзе са мной, пры мне. Без яго мне будзе маркотна… Без яго мне будзе нечага не хапаць”…

**IV блок “Дудцы беларускай” – 120**

**Э 1** У 2011 годзе споўнілася 120 гадоў з дня выхаду зборніка “Дудка беларуская”. У 1990 годзе да 150-годдзя Багушэвіча з’явілася факсімільнае выданне “Дудкі беларускай” 1891 года, падрыхтаванае “Мастацкай літаратурай” ***Факсімільe лацінскае слова, якое азначае перапісаны з чыйго-небудзь пісьма***. Значыць гэты зборнік выдалі такім, як ён выглядаў у выданні 1891 года.

***Э 2*** ***А зараз мы праверым, ці ўважліва вы слухалі экскурсавода. Давайце адкажам на пытанні віктарыны.***

1. Што азначае слова экспанат? *(прадмет выстаўлены напаказ у музеі ці на выставе)*
2. Пра які зборнік Ф. Багушэвіча вы сёння даведаліся? *(“Дудка беларуская”)*
3. У якім горадзе быў надрукаваны гэты зборнік? *(У Кракаве)*
4. Колькі гадоў споўнілася з дня выхаду зборніка ў 2011 годзе? *(120)m*

**Уводзіны**

Ашмяншчына, мая ты дарагая.
Бусліны клёкат. Жаўруковы спеў.
Паклон табе, Зямля мая святая…
Шляхі, шляхі… Шум векавечных дрэў.
Ашмяншчына. Тут песень Звонкіх мора,
Дзяўчат прыгожых – воч не адарваць.
І самыя ярчэйшыя тут Зоры
У небе цёмна-бэзавым гараць.
Ашмяншчына. Заўсёды маладая,
Цвіці, ў стагоддзях, радуйся, жыві,
Хай песня над табой Заўжды лунае
Як шчырае прызнанне у любві…

Ашмяншчына – унікальны куток не толькі Гродзеншчыны , але і ўсяго нашага беларускага краю. Ашмяншчына… край многавекавой багацейшай гісторыі. Мясцовасць раёна характарызуецца камяністасцю. На Ашмяншчыне – карані нашай Бацькаўшчыны, самабытнасці і культуры. Ашмяншчына – гэта цэлае сувецце імён літаратараў, навукоўцаў, мастакоў, рэвалюцыянераў, грамадскіх дзеячаў. Адным са знакамітых дзеячаў Ашмяншчыны, які мяне вельмі зацікавіў, з’яўляецца Анатоль Зянонавіч Вішнеўскі. Мне вельмі спадабаліся яго вершы, яго творчасць. Ім я зацікавілася па той прычыне, што маю магчымасць размаўляць з яго блізкімі і роднымі.

Мэта маёй работы – вызначыць прычыны паспяховай творчай дзейнасці таленавітага паэта, настаўніка і чалавека.

Я паставіла перад сабой наступныя задачы: даведацца, калі і пры якіх умовах быў створаны зборнік “Сонца ў хвалях блакіту ”.

Другой важнай задачай маёй працы я лічу вызначэнне прычыны вялікага поспеху зборніка, які, на мой погляд, скрыты ў асобе паэта, прасачыць яго творчую біяграфію і старонкі працоўнай дзейнасці.

Гэта работа зацікавіла ўсіх вучняў і педагогаў нашай школы, мяркую, яна будзе карысна жыхарам нашага раёна і, магчыма, вобласці, бо Анатоль Вішнеўскі – чалавек, які жыў і працаваў ў нашым раёне на карысць развіцця галіны адукацыі і культуры Ашмяншчыны і Гродзеншчыны.

**Глава 1. Вытокі натхнення**

Анатоль Зянонавіч Вішнеўскі нарадзіўся 31 мая 1965 года на хутары Асінаўка каля Ашмян у сям'і рабочага.

Тварам я ўпаду ў траву,
Каб яе асалоды напіцца.
Родны край, дзе з дзяцінства жыву,
Не магу табой не ганарыцца.

Не знайсці мне радней і мілей,
Чым старонка мая дарагая,
Ёй крывёю гарачай сваей
Пажыццёва служыць прысягаю.

24.10.03

Сюды, я думаў, не вярнуся,
Дзе сонца спала за гарой,
Куточак роднай Беларусі,
Маленькі і крылаты мой.
Буслы тут любяць пасяляцца,
І палымнее ўсход вясны,
А на маёй старэнькай хатцы
Месяц свае чаруе сны

Я помню домік свой і белы сад,
Які ў маі раем расцвітаў,
І на галінках белы вінаград

П'яніў душу і сэрца ап'яняў.
О сонца яснае, калісьці
Будзіла ўранку ты мяне,
І промень блытаўся ў лісці,
То прападзе, то зноў блісне.

Малы я быў тады, шчаслівы,
Лавіў той промень залаты,
Ён трапяткі, жывы, гуллівы
Жыве ў сэрцы праз гады

Маленькага Анатоля выхоўвала маці. Менавіта ад яе хлопчык пачуў цудоўныя казкі і вершы.

Гадзінамі не адрываючыся, мог ён слухаць меладычны голас маці, сцішыўшыся пад ласкавымі далонямі рук, што пяшчотна тулілі да сябе. І нездарма пазней паэт Анатоль Вішнеўскі напіша:

Я думаў – гэта раса,
А гэта – твае слёзы,
Я думаў – гэта дарога,
А гэта твае косы,
Я думаў – гэта світанне,
А гэта – твая ўсмешка.
Я думаў – гэта лёс,
А гэта твае рукі,
Што трымаюць мяне,
Матуля…

І не адзін, вядома, верш прысвяціў ён сваёй маці, добрай, спагадлівай, светлай…

Светлая, ласкавая, святая,
Вобраз твой у сэрцы я нашу,

Без цябе так пуста, дарагая,
А жыццё – бязмежны гул і тлум.
Без цябе даўно патухлі зоркі,
Толькі калі ў неба я гляджу,
Адчуваю, як камочак горкі
Выціскае мне з вачэй слязу.
А жыццё бяжыць сваёй дарогай,
Даганяю я твае гады,
Позірк твой ласкавай, добрай,строгай
Будзе ўслед за мной ісці заўжды.
2004

Любоў да кнігі ў Анатоля ўзнікла вельмі рана. Ужо ў дашкольным узросце ён пачаў збіраць уласную біліятэку. І калі маці ішла ў магазін, то лепшым гасцінцам для яго была новая купленая кніга. А яшчэ хлопчыка вабіла прырода . Лес, луг, рачулка чаравалі сваім хараством і неспазнанай таямніцай.

П’ю вадзіцу тваю я штодня,
П’ю паветра і сіняе неба,
Дорыць сэрцу часцінку агня.
Поле дорыць мне бохан хлеба.

Адзінокая песня лунае пад
небам крылатым,
Выгінаецца поле, як кошка,
што ласкі жадае,
І ўцякаюць кудысьці ўдаль
серабрыстыя хаты,
І бабуля ля студні смяецца
зусім маладая.
О радзімы куток, маё хворае

сэрца чаруеш,
Аплятаеш любоўю і клічаш,
завеш ты дадому,
О радзімы куток, я цалую
зямельку святую
І ўсміхаюся сонцу гарачаму
і маладому.
14.08.03
Зямля, дзе столькі песень спета,
Дзе калыханкаю звініць
У чабаровым лузе лета,
І рану лёгка загаіць,
Дзе салаўіныя дубровы,
Дзе сон-трава да ранку спіць,
Кахання велічныя словы
Нясуць жыццё, каб далей жыць.
Тут так утульна і прывольна,
Тут родны кут і родны край,
І сэрцу вольна, слову вольна,
Святлом тваім падыхаць дай,
Яго ты, брат, не забывай.
У пояс кланяюся полю,
Бярозкі белай не адняць,
І дзякуй Богу, што даў долю
Тут жыць і пець да скону дня.
У пояс кланяюся полю,
Дзе сонца светлае святлей,
І дзякуй Богу, што даў долю
Тут жыць і пець да скону дней.
24.01.04

Даўно мінула лета залатое,
Пакінуўшы свой сонечны загар,
І верасень крадзецца зноў за мною,
Надзеі поўны, поўны светлых чар.

Палаюць гронкі яркія рабіны,
Духмяны пах аж кружыць галаву,
Мой мілы край, цудоўны і адзіны,
Тваім паветрам чыстым я жыву.

Тваімі мураговымі лугамі,
Тваёю ласкаю сагрэты я,
Тваімі залацістымі агнямі
Жыве і поўніцца душа мая.

Даўно мінула лета залатое,
Пакінуўшы свой сонечны загар,
Мой мілы край, навекі жыць табою
Мне дадзены людзьмі і Богам дар.

У 1972 годзе пайшоў у першы клас Павяжскай васьмігадовай школы. У маляўнічым куточку Ашмяншчыны размешчана Павяжская базавая школа. Бягуць гады, ідзе час, мяняецца педагагічны калектыў, сталеюць былыя вучні, мяняецца воблік пабудовы. Але тут заўсёды весела…Вучыўся Анатоль старанна, з ахвотай. На жаль, неўзабаве захварэла маці, але выхаваннем хлопчыка занялася бабуля Вераніка Станкевіч і дзядуля Казімір Багушэвіч, якія сталі для Анатоля сапраўднай школай мудрасці, дабрыні, чалавечнасці.
Доўгімі зімовымі вечарамі любіў слухаць хлопчык цікавыя гісторыя і казкі. Дзядуля шмат ведаў вершаў, чытаў іх на памяць. Першы верш нарадзіўся ў

душы падлетка неяк сам сабой – па дарозе ў школу. Ён быў запісаны на шматку паперы:

Туман апошні ліжа снег,
Пад перазвоны раўчука
Спявае вечны гімн вясне
Сястра старэйшая – рака.
І ажылі палі, лясы,
Зямля скідае мёртвы грым,
Расчэсвае валасы
Бяроза грэбнем залатым.

## Глава 2. Прага да працы

Нарадзілася новае, нязведанае пачуццё – прага да творчасці. І ён пісаў вершы амаль кожны дзень у агульны сшытак. Неўзабаве пра гэта даведаліся ў школе , і па просьбе сяброў і настаўнікаў прыйшлося прынесці свой запаветны сшытак у школу і зачытаць перад класам некалькі вершаў. Настаўнікі падтрымалі, абнадзеілі, па-добраму дапамаглі юнаму паэту.

Паспяхова закончыўшы вучобу ў Павяжскай васьмігадовай школе, прадоўжыў вучобу ў Барунскай сярэдняй школе.

Да рэспубліканскага слухача вершы Анатоля Вішнеўскага дайшлі па радыё. Была такая перадача “Жывое слова” на Беларускім радыё. Вёў яе вядомы літаратурны крытык Уладзімір Юрэвіч – чалавек-легенда, дыктар Беларускага радыё ў гады Вялікай Айчыйнай вайны. І вось ён прачытаў вершы Анатоля Вішнеўскага па радыё з прыхільным водгукам на іх. Потым у гэтай перадачы вершы юнага паэта гучалі не раз.

Дэбют у друку адбыўся ў лютым 1986 года ў часопісе “Маладосць”. Вершы Анатоля Вінеўскага “З выбраных вамі, людзі, песень”, “Падарунак”, “Каханне”, “Просьба” былі адобраны і падрыхтаваны да друку загадчыкам аддзела паэзіі Яўгеніяй Янішчыц.

О, салодкі кахання мёд,
Для душы маёй, нібы бальзам,

О, каханая, я не прадам,
Не забуду наш светлы палёт.

Мы кружылі з табой над Зямлёй,
Калыхала нас зорка-зара,
І прызнацца табе пара,
Ды ўсё штосьці, як сам не свой.

Завяло нас каханне з табой
На рамонкавы белы лужок,
Дзе над намі кружыў матылёк
І табе было добра са мной.

Працягні сваю мне далонь,
Развітацца нам не пара ,
Запаліла ў сэрцы зара
Непагасны кахання агонь.
9.07.04

Пасля службы ў Савецкай Арміі працаваў піянерважатым у Павяжскай школе і ў гэтыж час паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на завочнае аддзяленне факультэта беларускай і рускай мовы і літаратуры. “Гады вучобы ва ўніверсітэце, - успамінаў Анатоль Вішнеўскі, - многае далі зразумець. Тут я прайшоў школу пад кіраўніцтвам такіх выдатных прафесараў і дацэнтаў, як Алег Лойка, Таццяна Шамякіна, Дзмітрый Бугаёў, Вячаслаў Рагойша і многіх іншых вядомых не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі вучоных і літаратурных крытыкаў. Часта ўспамінаецца Вольга Васільеўна Казлова, якая не толькі давала навуковыя веды, але і расказвала шмат павучальнага з жыцця вядомых беларускіх пісьменнікаў, якіх, пачынаючы з Янкі Купалы і Якуба Коласа, ведала асабіста.”

## Глава 3. Творчы шлях

А далей была праца настаўнікам у Анкудскай базавай школе, у Вайшнарышскай – спачатку настаўнікам, а пасля намеснікам дырэктара. У хуткім часе быў прызначаны дырэктарам Мураванаашмянкоўскай школы, адкуль пераведзены на пасаду метадыста, а потым інспектара аддзела адукацыі. Але ўсё ж школа і настаўніцкая праца перацягнулі на свой бок. Педагагічная праца была яго прызваннем, дзецям дарыў ён сваю любоў і шчырае сэрца:

Сінявокія і смяшлівыя, хлопчыкі мае і дзяўчынкі,
Русакосыя, чарнавалосыя Пеценькі і Ірынкі,
Будзе вам сонца свяціць і будуць вёсны ў цёплым блакіце,
Толькі вы помніце добрыя словы, толькі людзей любіце.
Будуць вам кланяцца ў полі рамонкі і васількі ў жыце,
Толькі расціце з душой адкрытай, толькі людзей любіце.
Збудуцца мары, я веру ў гэта, толькі любоў не губіце,
Будуць шчаслівымі вашыя вёсны, толькі людзей любіце,
Толькі помніце маці, толькі дабро рабіце…
(“Сваім вучням”)

У апошнія гады працаваў настаўнікам – філолагам у Жураўскай і Вайшнарышскай базавых школах.

«…Мой любимый учитель – это Вишневский Анатолий Зенонович, учитель белорусского языка и литературы и мой классный руководитель. Это человек, который полностью отдается своему делу. Сколько сил, времени и здоровья он отдал нам. Он растил и воспитывал нас, как своих детей. И я хотела бы сказать огромное спасибо ему за понимание, за любовь, за воспитание. И извиниться за себя и за весь класс. Ведь нередко мы обижали его и не всегда были ему благодарны. »

«…Он быстро идет по коридору. Он спешит на урок, ему хочется донести до нас, своих учеников, суть предмета и свои мысли. Предмет литературы

прекрасен. Он впитывает в себя все прекрасные проявления жизни, он помогает понять ее, учит говорить, слушать и думать…
Анатолий Зенонович заходит в класс – в нем столько света, тепла и доброты, одна его усталая улыбка разом поднимает тебе настроение. Сильный, прекрасный, деятельный и неунывающий. Ему хочется говорить только хорошие слова. А его добрые глаза никогда не обманут тебя, они научат любить людей и радоваться жизни».

«…Анатолий Зенонович - очень добрый и отзывчивый человек, с которым мы всегда можем решить все проблемы, возникающие в нашем классе, или просто обсудить интересующие нас вопросы. Очень часто мы проводили различные мероприятия и экскурсии, организованные нашим классным руководителем. Посещали слеты, концерты. Наша школьная жизнь, благодаря Анатолию Зеноновичу была интересной и насыщенной. В нашем коллективе всегда тепло и уютно. Огромное ему спасибо!»

«…Есть один учитель, которому я буду всегда благодарна за всё то, что он мне дал, который будет для меня примером во всём. Это Вишневский Анатолий Зенонович , учитель белорусского языка и литературы … Анатолий Зенонович действительно прекрасный преподаватель и человек. Каждый урок у нас проходил настолько интересно и увлекательно, что часто мы просто не замечали, как быстро проходит время. Анатолий Зенонович объяснял доступными и легко запоминающимися словами. Он любил свой предмет, серьёзно подходил к своему делу и заинтересовывал учеников. Я буду всегда благодарить и любить этого прекрасного преподавателя».

«…Я хочу рассказать о своем любимом учителе. Это – Анатолий Зенонович, учитель белорусского языка и литературы. В нем есть какой-то огонек, который подбадривал всех. Еще мне очень нравилось, как он шутил. У него всегда были очень добрые шутки. Он очень добрый и щедрый человек».

Лірыка Анатоля Вішнеўскага ахопліве грамадскае жыццё, свет прыроды і свет інтымных перажыванняў. У ёй шырока раскрыты пошукі сэнсу жыцця, роздум аб вечным, эстэтычныя ідэалы паэты. Вершы яго стройныя кампазіцыйна-мілагучныя. Паэт добра валодаў такімі формамі верша, як верлібр, санет, трыялет, элегія, рубаі і інш. У апошні час спрабаваў пісаць казкі для дзяцей, была задума напісаць дэтэктыўную аповесць.

Пачынаючы з 1988 года, вершы паэта перыядычна друкаваліся на старонках раённай газеты "Ашмянскі веснік", неаднаразова – у "Гродзенскай праўдзе", "Настаўніцкай газеце", "Літаратура і мастацтва", часопісах "Маладосць", "Роднае слова", "Бярозка". Пры Ашмянскай раённай цэнтральнай бібліятэцы выдадзены яго зборнік паэзіі "Хвіліны шчасця і самоты" (2002 г.). У раённай кнізе "Памяць" змешчаны матэрыялы аб жыцці і творчасці паэта.

Закранаюць душу і выхоўваюць лепшыя пачуцці вершы Анатоля Вішнеўскага, які вельмі любіў нашу школу, з задавальненнем наведваў музей. Таленавіты, улюбёны ў сваю зямлю, у жыццё, у людзей, ён ішоў да чытачоў з адкрытым сэрцам. Матывы яго лірыкі разнастайныя: то лірычныя, то задуменныя, то сур'ёзна-шчымлівыя, то разважлівыя.

Не забывай, што ты чалавек,
Век твой кароткі, імгнення век.
Па чалавечых і Божых законах жыві,
Не забывай, што ты чалавек.

……………………

Мой светлы дзень, ты зноў прайшоў,
Адрэзаны кавалачкам жыцця.
Адпета песня маладых вятроў,
І ўсё бліжэй заслона небыцця.
І ўсё мілей становіцца мой дом,
І твары блізкіх мне ўсё даражэй.

Чаруе восень за маім акном,
Ды за вясну яна мне ўжо мілей.

І сцеліць мне дарогу лістапад,
Дарогу, што вядзе ў халодны край.
Жыццю свайму, якому быў так рад,
Тады скажу апошняе "Бывай".

Ён пайшоў з жыцця ў поўным росквіце сіл, на 41-м годзе жыцця. А для нас пакінуў загадку, якую сам не паспеў разгадаць: ён меркаваў, што з'яўляецца далёкім сваяком Багушэвіча. Спадзяёмся, што калі-небудзь нам удасца знайсці разгадку.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Прыгожая і самабытная, старажытная і юная зямля Ашмяншчына. Яна прываблівае сваёй прыродай, адноўленымі збудовамі, чалавечымі характарамі. Багатая на таленты, ашмянская старонка заўжды будзе квітнець у творчасці паэтаў і пісьменнікаў, мастакоў і фотамайстроў.

Закранаюць душу і выхоўваюць лепшыя чалавечыя пачуцці вершы мясцовых паэтаў. Сярод іх Анатоль Вішнеўскі. Шкада, што яго жыццё абарвалася так рана. Сваёй творчасцю ён радаваў не толькі чытачоў раённай газеты. Не раз друкаваўся ён у часопісе "Маладосць", "Настаўніцкай газеце", "Гродзенскай праўдзе", з вершамі выступаў на рэспубліканскім радыё.

Да чытачоў ішоў ён з добрым сэрцам, вялікай любоўю, шчырай і шматграннай. Ён прызнаваўся ў любові сваёй зямлі, сваёй жонцы, тым людзям, з якімі жыў і працаваў.

…Лютаўскімі днямі Анатоля Вішнеўскага не стала, аднак яго талент, яго высокамастацкая творчасць будзе жыць вечна ў памяці ашмянцаў і ўсіх прыхільнікаў паэзі…

У зборнік Анатоля Вішнеўскага “**Сонца ў хвалях блакіту**” ўвайшлі выбраныя творы 2003 – 2006 гг.

Яго паэзія напоўнена лірызмам, шчырасцю, філасофскім роздумам, асэнсаваннем духоўнага свету сучасніка, любоўю да Радзімы.

Анатоль Вішнеўскі рыхтаваў гэты зборнік да друку, але няўмольны лёс спыніў сэрца паэта. Аўтар не пабачыць кнігі, але слова яго жыве для ўдзячных чытачоў.

ДАДАТАК















## ШЧЫРАСЦЬ

Шчырасць – слова якое,
Нібы жытнёвае поле,
Нібы рунь залатая,
Нібы вада святая.
Шчырасць – вясёлка на небе,
Парастак светлы на глебе,
Зорка, што не згарае,-
Вось яна шчырасць якая.

2003

* * *

Сякера вострая пад корань
Мяне сячэ, а я стаю,
Засухай чорнай мяне морыць,
А я знясілен, ды стаю,
Вадой затопліваюць звонку,
Я задыхаюся – стаю,
І сваю родную старонку,
Сваё сумленне, як скарбонку,
Не прадаю.
Так мала зроблена за дзень,
Так многа страчанага часу.
І цемры ўжо крадзецца цень,
Святла нямнога для прыпасу.

Дарога знікла за гарой,
І палахліва ные вецер.
Куслівых толькі думак рой
Трывожыць аб усім на свеце.

Як будзе мне зіму пражыць,
Душу сваю не замарозіць,
І як каханне не спаліць,
І веру як не абмарозіць.
Не паспяваю крок зрабіць,
За сонцам я не паспяваю,
Не паспяваю ўсё забыць,
Жыццё не ўмею разнастаіць.

Не ўмею быць завідным, злым,
Не ўмею адбіраць святыні,
Не ўмею помсціць я жывым,
Гару штодня ў агнях Хатыні.

Не ўмею раўнадушным быць,
Прад жабраком захлопнуць дзверы,
Не ўмею па цячэнні плыць
І ў жыццё бясконца веру.
Бэзавы ранак, ружовы ўсход,
Зачараваны, стаю я ля весніц
І прадаўжаю жыццёвы палёт
У небе вясновым, дзе сонца і песня.

Шырыцца неба, ярчэе блакіт,
Круціцца свет, як на кінаэкране,
Тысячы зорак, мільёны арбіт
Клічуць і клічуць мяне на спатканне.

Колькі наперадзе дзён ці гадоў,

Усё таямніцай нябеснай пакрыта,
Сніцца чамусьці адзін з маіх сноў
***Я і празрыстае мора блакіту***
Сухой травою пахне золак,
Вакол шапоча цішыня,
Майго жыцця імчыцца кола,
І карацее дзень штодня.

І водар кветак вусны студзіць,
І спеў птушыны галасней,
Не салавей наранку будзіць,
А воран чорны на сасне.

Закон прыроды разумею,
Ды ад таго мне не лягчэй.
…А сэрца шчасцем занямее,
Калі зазвоніць салавей.

Каменняў многа кінута ў мяне
І бруду многа выліта таксама,
І як бярозку маладую гне,
Ламае лёс, затым – на пілараму.

Ды ўсё ж не буду наракаць на лёс,
Што заслужыў – то тое зараз маю,
Каменні сыплюцца, а я без слёз,

А я сваю пазіцыю займаю.

Заўжды з сумленнем ладзіць са сваім,
Нялёгкая, скажу я вам, работа
Жыць розумам сваім, а не чужым
І крылы берагчы для пералётаў.

Каменняў многа кінута ў мяне
З улюканнем і з крыкамі заўзята,
Дык ведайце, хрыбет мой не сагне
Ніхто. Хоць, можа, хочацца каму занадта.

Тварам я ўпаду ў траву,
Каб яе асалоды напіцца.
Родны край, дзе з дзяцінства жыву,
Не магу табой не ганарыцца.

П'ю вадзіцу тваю я штодня,
П'ю паветра і сіняе неба,
Дорыць сэрцу часцінку агня,
Поле дорыць мне бохан хлеба.

Не знайсці мне радней і мілей,
Чым старонка мая дарагая,
Ёй крывёю гарачай сваей
Пажыццёва служыць прысягаю.

А душа мая беспрытульная
Так і лётае з краю ў краю,

Неаблашчаная, неатуленая
Сярод чорных вароніных стай.
І з усімі гатова дружыць,
Хай жабрак у яе закахаецца,
З жабраком яна будзе жыць.
Да каго б хаця прытуліцца ёй,
Да такой вось душы другой
І паплакаць бы, пажурыцца ёй,
Дакрануцца гарачай шчакой.
Толькі холад калючы і золкі
Не дае ёй прытулку ніяк,
І калючх вачэй іголкі,
І жыцця здаравенны кулак.
Адзінокаю птушкай кукуе
Мая стомленная душа,
І ніхто яе крыку не чуе,
І не хоча ніхто суцяшаць.

Той колкі дождж калоў, як сто іголак,
Мы прабіраемся імшарамі жыцця,
Гаркава – свежы пах пасохлых зёлак
Мяне вяртае з тога небыцця.

Дзень дагарэў свавольны і руплівы,
Рыпяць памалу колы ды рыпяць,
І месячык крадзецца палахліва,
І галасы далёкія звіняць.

І болем аддаецца сто іголак,

Хоць дзень прайшоў і выкраслен навек.
Яшчэ адзін лісток упаў у столак,
Памёр ці нарадзіўся чалавек.

Агнём палае захад,
Ружовы, як шчокі дзяўчыны,
І доўжыцца мой палёт,
І чуецца спеў салаўіны.

І хочацца жыць і жыць
Пад небам бэзава-сінім,
Вадзіцу з крыніцы піць,
Пакуль душа не астыне.

І хочацца верыць, любіць
Жанчыну, Радзіму і маці,
І ласку сваю дарыць
Старэнькай матулінай хаце.

Няма цяжэй, чым боль душы,
Яе не выплакаў я слёзы
І па вуглях ступаю босы
У трывожна-вогненнай цішы.

Няма цяжэй, як боль памылак,
Гарыць ён у маёй душы
І скрозь крутыя віражы
Усё коле,коле часу шыла.

Душа распята на крыжы,
Яна, пакутніца святая,
На свеце гэтым дагарае…
Няма цяжэй, чым боль душы.

* * *

Не пакідай мяне, надзея,
Малю цябе, не пакідай,
Калі ў грудзях пахаладае,
Свайго цяпла хоць крыху дай.
Не пакідай мяне, надзея,
Жадаю быць заўжды з табой,
Калючы вецер калі вее,
Прыйдзі, пабудзь тады са мной.
Калі балюча сэрца стогне,
Глыток вады гаючай дрогне,
Малю й тады, не пакідай.

* * *

У вочы ясныя блакіту,
Як зачарованы, гляджу,
Былое ў памяці буджу,
Натхненнем і святлом спавіты.

Іду туды за крокам крокам
У сваё празрыстае былое,
У сваё юнацтва залатое,

Дзе мой парог, дзе мой выток.

Ад хвалявання сэрца млее
І сум накоціцца ракой,
І неўпрыкмет змахну рукой
Слязінку. Што ж… і я старэю.

* * *

Пакінуў вугал я радзімы,
У край далёкі шлях павёў,
Як у час даўні пілігрымы,
І сёння я блукаю зноў
У лясах памяці, ля сосен,
Стагоддзяў звонам што звіняць,
А на двары блукае восень,
Ды ногі стомлена баляць.
Што я шукаў у свеце гэтым,
Чаго ішоў,чаго іду?..
У душы застаўся я паэтам,
А слоў для песні не знайду.

* * *

Не зачыняйце прада мною дзверы,
Я столькі грукаў кулаком у іх,
Я столькі перажыў і столькі верыў
У праведнасць і мудрасць вашых
кніг.
Я не святы. Канечне ж, я залішне
Несправядлівы, можа, да другіх,
І апраўданне ў тым, што проста лішні

І што чужы. Чужы сярод сваіх.

Я з раненай душой жыву даўно ўжо,
Ды толькі хто заўважыць рану там.
Хто песню недапетую прадоўжыць,
Хто склеіць лёс, разбіты папалам.

* * *

Свецяцца вокны, адчынены дзверы,
Сэрца адчынена для дабрыні,
Хто мне паверыць, хто мне паверыць,
Промню танюсенькаму з вышыні.

У тое, што толькі дабром чалавечым
Шчасце магчыма дарыць для людзей,
У тое, што будзе вялікім і вечным,
У тое, з чым звязана столькі надзей.

* * *

Не бывае позна ніколі
Увайсці ў адкрытыя дзверы,
Памаліцца: душу спатоліць,
Павярнуцца тварам да веры,
Несці крыж свой зямны
пажыццёва
І ўсю выкінуць з сэрца атруту,
І шукаць толькі добрыя словы

У дні радасці і дні пакуты.

**ЭЛЕГІЯ**

Песню далёкую вецер даносіць,
Вечар сінее над пропасцю дня,
Свежага ветру душа мая просіць,
Шпаркага рукі жадаюць каня.

І скрозь смугу, скрозь гады,
як у госці,
Мы да вытокаў сваіх паляцім,
Час там стагоддзі нястомна малоціць,
Ператварае ў прывідны дым.

Спраўна працуе гадоў малатарня,
Смерць. Нараджэнне. Па- новаму зноў,
І скарачае пакрыху сячкарня
Век наш на год ці на колькі гадоў.

І не вярнуць той хвіліны шчаслівай,
Як быў вясёлы ты й малады,
Пырхнулі птушкай з-пад ног
палахлівай
Мілыя слаўныя тыя гады.

Шпаркі мой конь ужо крыху храмае,
Песня гучыць, ды ўжо горыч у ёй,
Ах ты, пара, ты, пара залатая,
Што ж ты мяне не забрала з сабой.

* * *

Дзяцінства прыснілася казка,
У сэрцы той вобраз чароўны,
І абаранкаў звязка,
І мёд той ліповы, цудоўны,
І маці ў прыгожай сукенцы
Яшчэ маладая, жывая,
Ды сонейка ў акенцы
З промнем ласкавым гуляе,
І ўсё яшчэ будзе толькі,
Жыццё ўсё як на далоні,
Ды шчасця наперадзе столькі,
І не сівыя скроні.
Міргае дзяцінства вока,
І сэрца гарачае б'ецц,а
Усё ад мяне так далёка
І блізка гэтак здаецца.

* * *

Палёт чмяля. Як б'е ў бубен хтосьці,
Палёт чмяля. Ён працінае дзень,
Спякота ўжо, і хочацца ў цень,
Дзе матылькі сустрэнуць, нібы госця.

І раптам звон касы ад мрой абудзіць,
Пара,браток, за працу брацца ўжо,
Глядзіш – пракосы, а затым – стажок…
Працоўныя ў нашай вёсцы людзі!

Я слаўлю працу, велічную працу,
Дзе дзынькание касы, і песня мкне,
І кубак малака смачней ўдвайне,
Чым звон кілішкаў у чужых палацах.

* * *

На сэрцы цяжкія ўспаміны, нібы ніці,
Іх змог бы выразіць хіба што ў граніце,
А калі ў вочы гляну агнявыя,
То думкі стануць васілёчкамі ў жыце.

* * *

Шукаю сам сябе я ў цемры ночы
І рой пачуццяў страчаных шукаю,
Ды толькі філін дзіка зарагоча,
А я чакаю шчасце ды чакаю.

Чаго чакаць, што страчана навекі,
Гадоў былых загубленае свята,
І вымушаны зносіць кпіны, здзекі,
Якіх і так было ў жыцці багата.

Што наракаць на лёс?
Пустая трата
Каштоўных тых хвілін, што не хапае,
Каб зноў жыццё ператварыць у свята…
На жаль, яно ў вырай адлятае.

І хочацца пакаяцца набожна

За ўсё, што дрэннага зрабіў

на свеце гэтым,

І пакланіцца ў пояс, калі можна,

Настаўнікам, артыстам і паэтам.

* * *

Светлавалосая раніца ў палаце бальнічнай,

І збалелае сэрца б’ецца не ў такт,

Ды мільгае жыццё сіратліваю знічкаю

І няўмольна бяжыць, і няўрымсліва так.

У гэтым годзе так рана шпакі прыляцелі,

А за вокнамі шчодра буяе вясна,

А я з мінай жыву ў параненым целе,

Узрасла прада мною глухая сцяна.

Мо параніла сэрца чэрствасць людская

І цікае злосна ў сэрцы яна,

Не забываецца і не знікае

Чэрствасць людская – глухая сцяна.

18.04.04

* * *

Каму даецца радасць,

каму даецца пакута

Ці золата поўны ранец,

ці поўная торба атруты.

Ідзем па жыцці бяспечна,

І сыплюцца зоркі з неба,

А ты ў пошуках вечных

Кавалачка жытнёвага хлеба.

Каму даецца шчасце,

каму даецца пакута

Ці золата поўны ранец,

ці поўная торба атруты.

* * *

Бруднай лужай старасць разлілася,
Не гляджу даўно ў люстэрка я,
І няведамая цемра гасіць
Дзень, дзе маладосць жыве мая.
Толькі маладою застаецца
светлая душа,
Што мне з ёй рабіць?
Проста так нічога не даецца,
З кожным днём усё складаней жыць.

20.04.04

* * *

Што даецца – не перайначыць,
Што пражыта - не змяніць,
Магчыма, усё было б іначай,
Каб зноў пачаў нанова жыць

Магчыма. Толькі дзень пражыты
Памылкі новыя нясе,
А заўтра дымкаю закрыта,
Старэем, вянем пакрысе.

Ды вера штось не пакідае,
Што новы разгарыцца дзень,
Што зноў на сэрцы прасвітае,
Салюты шэрай знікне цень.

* * *

Вецер стукае ў акно,
І крыўляюцца шэрыя шыбы.
Я, здаецца, жыву так даўно
І жыву вечна, здаецца хіба.
І шум ветру я чуў сотні год,
Сотні год- скавытанне завеі.
Нібы шэры аблезлы кот,
Месяц дзесьці далёка шарэе.
У павуцінавай сетцы мой лёс,
Вырываецца з путаў дарэмна…

2004

* * *

Я сонцу светламу дзіўлюся,
Дзіўлюся гнуткай вербе я
І шпаркім скокам вераб'я,
Нібы дзівак я той, смяюся

Мне добра: тут мой родны кут,
І клён шуміць сваёй лістотай,
Я не сябрую з адзінотай,
І зразумеюць мяне тут.

Нядрэнны брат, і муж, і сын,
Я чую поруч плячо друга,
А калі раптам стане туга,
Не застануся я адзін.

Святлее ў вачах, і на душы світае,
І ззяе дзень пры свечках залатых,
І ўсё вакол мяне цудоўна ажывае,
І добра тут, у свеце для жывых.
Тут для жывых свет ажывае гукі,
І музыка ледзь чутная гучыць…
Нябачныя працягвае мне рукі
Маё жыццё…
каб жыць,
каб жыць,
каб жыць…

## НЫРАЮ Ў ПАМЯЦЬ

Не першы раз туды ныраю
У хвалі памяці сваёй,
Нічога я не забываю,
І ўсё са мною, ўсё са мной.

Матулі рукі, вочы дзеда
І самастойны першы крок.
“Здароў!” - вясёлае суседа
Ды палахлівы матылёк.

Каханне першае трапеча,
І салодкі, і нямотны крык,
Так як ад першага ад верша,
Які знянацку быў узнік.

Калі ў гневе я бываю,
Каб не згубіць душы жывой,

Я неўпрыкмет тады ныраю
У хвалі памяці сваёй.

Вучэбна - метадычнае выданне

Выкарыстанне экспазіцыі музея ўстановы ў выхаванні грамадзянскасці, патрыятызму навучэнцаў

З вопыту работы

Адказны за выпуск  Г.Б. Лукша

Камп'ютарны набор А.М. Дудзінская

Падпісана да друку  20.03.2012г.

Надрукавана на прынтары ДУА "Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К. Багушэвіча"

231103, аг. Жупраны, вул. Гагарына, 3, Ашмянскі раён, Гродзенская вобласць

Тэл. 8 (01593) 37143

ББК 74.2
Л-80

Складальнік Г.Б.Лукша, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА
"Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча"
Рэцэнзент С.І.Шукеловіч, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце ДУА
"Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча"

**Л-80** **Выкарыстанне экспазіцыі музея ўстановы адукацыі ў выхаванні грамадзянскасці, патрыятызму моладзі:** з вопыту работы/ склад. Лукша Г.Б – ДУА "Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча", 2012. – 53с. Выданне другое дапоўненае

Прадстаўлены вопыт дзейнасці ва ўстанове адукацыі літаратурнага музея, які з'яўляецца цэнтрам грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання моладзі. Праз удзел у стварэнні і папаўненні экспазіцыі музея, распрацоўку тэкстаў і правядзенне экскурсій, даследаванне невядомых старонак жыцця Ф.К.Багушэвіча вучні больш дэталёва знаёмяцца з гісторыяй і культурай сваёй краіны, жыццём людзей у ёй і, такім чынам, далучаюцца да агульнанацыянальных каштоўнасцей свайго народа, пачынаюць яшчэ больш любіць сваю краіну і маленькую радзіму. Дадзеныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны на ўроках беларускай літаратуры, мовы, гісторыі, прадмеце "Мая Радзіма Беларусь", на пазакласных мерапрыемствах.

Адрасаваны настаўнікам, кіраўнікам устаноў адукацыі і школьных музеяў.

ББК 74.2

© Г.Б.Лукша, 2012
©ДУА"Жупранская сярэдняя школа
імя Ф.К.Багушэвіча", 2012

Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Аддзел адукацыі Ашмянскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Жупранская сярэдняя
школа імя Ф.К. Багушэвіча

# Выкарыстанне экспазіцыі музея ўстановы адукацыі ў выхаванні грамадзянскасці, патрыятызму навучэнцаў

Жупраны 2013